Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 СНЕЖНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №232 (28596)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Сталеем мы, сталее спектакль**

СТАР. 5



**Каляндар стрыжак на снежань**

СТАР. 16



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Анатоль ЧОРНЫ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:**

*«У наступным годзе ў краіне намечана пабудаваць 4 млн кв. м жылля. Плануем больш будаваць арэнднага жылля. Гэта сусветная практыка. Такое жыллё асабліва запатрабавана моладдзю. Людзі не прывязваюцца да ўласнай нерухомасці, яны вольныя ў выбары месца працы. Едуць туды, дзе могуць працаўладкавацца. Арэнднае жыллё дае магчымасць знайсці добрую работу, да таго ж яно дазваляе маладым людзям вырашыць кватэрнае пытанне, не абцяжарваючы сябе крэдытамі. Будаваць жа ўласнае жыллё яны змогуць з часам».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.12.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0123 | ▲ |
| Еўра | 2,3872 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0343 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0740 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Дамінанты бяспекі

## У Мінску прайшоў саміт кіраўнікоў дзяржаў АДКБ



Фота БЕЛТА.

**Палац Незалежнасці чарговы раз стаў цэнтрам жыцця геапалітычнага макрарэгіёна. Прэзідэнцкія картэжы пад'язджалі адзін за другім: спачатку прыбыў Нурсултан Назарбаеў, Прэзідэнт Казахстана, потым — Серж Саргсян, кіраўнік Арменіі, за ім — Прэзідэнт Кыргызстана Сааранбай Жээнбекаў, далей — лідар Таджыкістана Эмамалі Рахмон і Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін. Лідары ўсіх шасці краін — удзельніц Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы прыехалі ў Мінск на саміт.**

СТАР. 2

■ Прамая лінія

## Хто заплаціць за разбіты ў краме посуд?



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Учора ў рэдакцыі «Звязды» прайшла прамая лінія па правах спажыўцоў. На пытанні чытачоў адказвала старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Ганна Уладзіміраўна СУША.**

***— Выпадкова разбіў бутэльку ў краме. Ці павінен я за яе заплаціць?***

— Трэба аналізаваць, з якой прычыны гэта адбылося. Многія лічаць, што пакуль не ўзялі чэк у рукі, не нясуць ніякай адказнасці за тавар. Але па правілах рознічнага гандлю пакупнік, які незнарок нанёс пашкоджанне маёмасці крамы, мусіць яе аплаціць. Нават калі нешта разбіла ваша дзіця, а не вы самі, таксама трэба будзе кампенсаваць урон.

Бывае і віна крамы. Напрыклад, вы разбілі посуд, бо вузкі праход паміж паліцамі быў застаўлены каробкамі. Ці паслізнуліся на нявыцертай падлозе. Часам справа ў дрэннай выкладцы тавару: з-за недахопу плошчы крама спрабуе ўціснуць на стэлажы як мага больш тавараў. Тады спажывец плаціць не павінен. Назірала нейк выпадак за мяжой: пакупніца дацягнулася да верхняй паліцы, вырашыла ўзяць пачак кавы, а той паляцеў на адваротны бок, дзе на такім жа ўзроўні стаяла віно. Шэсць бутэлек разбілася. Але крама не спаганяла грашовыя сродкі за гэты інцыдэнт.

Заўсёды ў гандлёвых аб'ектах ёсць відэакамеры, і, калі ўзнікае спрэчнае пытанне, настойвайце, каб пагглядзелі запісы і ўбачылі, у чым насамрэч была прычына пашкоджання тавару.

**(Поўны варыянт прамой лініі чытайце ў наступных нумарах «Звязды».)**

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Дынастыя

## «КАЛІ ДАЧКА НА ЗМЕНЕ, ТАТА СТАРАЕЦЦА ЎДВАЙНЕ»

### Як тры пакаленні сям'і працуюць на адным заводзе

**Працоўная дынастыя БАБІНОВІЧАЎ склалася яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя. Вось ужо тры пакаленні гэтай сям'і шчыруюць на Мінскім трактарным заводзе. Толькі ўявіце: іх агульны працоўны стаж налічвае 178 гадоў! Бацькі і дзеці расказваюць, што іх прывяло ў сферу машынабудавання, і як работа дапамагла сустрэць сваіх палавінак.**

### Да машын цягнула з дзяцінства

На прахадной сустракаемся з Таццянай Мікалаеўнай. Чакаем са змены мужа. Сама Таццяна выйшла на пенсію два гады таму, але работнікі завода дагэтуль добра яе памятаюць: ледзь не кожны другі падыходзіць павітацца.

— Мікалаеўна, як справы?

— О, Мікалаеўна! Даўно не бачыліся.

«Гляджу, мужчыны нашы з узростам усе «пашырэлі», — жартам заўважыць пасля Таццяна. А калі сур'ёзна, то ў транспартным цэху жанчына адпрацавала 39 гадоў, таму і з калектывам у добрых адносінах. «На Таццянін дзень мне чалавек дзесяць з былых калег патэлефанавалі павіншаваць. Не забываюць», — дзеліцца яна.

А вось якраз і муж падышоў — Уладзімір Уладзіміравіч. Пакуль дзеці яшчэ на рабоце, гутарым з парай пра гады, праведзеныя на заводзе.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ГАЗАВУЮ ПЛІТУ ЦІ МІКРАХВАЛЁЎКУ!**

**Працягваецца падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!**

**КУПОН ДЛЯ ЎДЗЕЛУ Ў РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ на 5-й стар.**

# Дамінанты бяспекі

## НЕШАРАГОВАЯ ПАДЗЕЯ

З раніцы прэс-цэнтры палаца запоўнілі журналісты з усіх дзяржаў-удзельніц аб'яднання. У сённяшніх рэаліях саміт мае важнае значэнне як для названых краін, так і для ўсёй Еўропы і Азіі. Выклікі і пагрозы прымушаюць прымаць рашучыя меры. Так, учора на парадку для падпісання стаяў 21 дакумент.

Арменія, Беларусь, Казахстан, Кыргызстан, Расія і Таджыкістан каардынуюць свае намаганні ў плане бяспекі. Кіраўнікі гэтых дзяржаў абмеркавалі вынікі для аб'яднання за 2017 год, які прайшоў, дарэчы, пад старшынствам Беларусі. Наша дзяржава ставіла задачы ўзмацніць уплыў арганізацыі на міжнароднай арэне, павысіць аператыўную гатоўнасць Калектыўных сіл, забяспечыць эканамічную бяспеку дзяржаў-членаў, а таксама рэалізаваць комплекс дадатковых мер па супрацьдзеянні міжнароднаму тэрарызму, распаўсюджванню наркотыкаў і незаконнай міграцыі ў рэгіёнах калектыўнай бяспекі. Гэтыя тэмы абмяркоўваліся на працягу года, цяпер жа настаў час падагульніць зробленае і выпрацаваць задачы на перспектыву.

Сёлета АДКБ святкуе сваё 25-годдзе. Аляксандр Лукашэнка, вітаючы лідараў, прызнаўся, што для Беларусі вялікі гонар старшынстваваць у такі год. Асабліва ён звярнуўся да Сааранбая Жээнбекава, які ўпершыню ўзяў удзел у сесіі Савета калектыўнай бяспекі АДКБ. Гэта, дарэчы, адзін з першых замежных візітаў нядаўна абранага лідара Кыргызстана.

— Беларусь з'яўляецца паслядоўным прыхільнікам актыўнага ўзаемадзеяння ў рамках Арганізацыі, усебаковага павышэння рэзультатыўнасці яе дзейнасці, умацавання аўтарытэту на міжнароднай арэне, — заявіў кіраўнік нашай краіны ва ўступным слове на пасяджэнні Савета калектыўнай бяспекі ў вузкім складзе. — Упэўнены, што цяперашняя сесія надасць новы імпульс развіццю АДКБ, прадэманструе пазітыўную дынаміку ў вырашэнні пытанняў гарантавання агульнай бяспекі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## САМЫЯ БЛІЗКІЯ

Пасяджэнне Савета калектыўнай бяспекі ў вузкім фармаце Аляксандр Лукашэнка назваў «сапраўды адкрытай і прынцыповай размовай самых блізкіх у гэтым свеце дзяржаў».

Ён канстатаваў, што ў вузкім складзе ў канструктыўным, давяральным, шчырым ключы былі абмеркаваны тэндэнцыі развіцця міжнароднай абстаноўкі і яе ўплыў на сітуацыю ў зоне адказнасці АДКБ.

— З задавальненнем адзначу агульнасць нашых поглядаў адносна сучасных пагроз, з якімі сутыкаюцца дзяржавы — члены АДКБ, эфектыўнасць абранай стратэгіі па іх мінімізацыі. Нашымі сумеснымі намаганнямі вялася і вядзецца планамерная работа, накіраваная на павышэнне міжнароднага аўтарытэту АДКБ, пашырэнне клуба яе прыхільнікаў, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нашай краіны звярнуў увагу, што развіваюцца найбольш важныя формы знешнепалітычнай каардынацыі ў рамках аб'яднання:

— У фармаце АДКБ удалося дасягнуць канцэптуальнага замацавання адзіных падыходаў да забеспячэння інфармацыйнай бяспекі, прывесці ў адпаведнасць з перадавымі тэхнічнымі патрабаваннямі базавыя элементы сістэмы крызіснага рэагавання. Канкрэтныя крокі зроблены на шляху фарміравання ўмоў для выкарыстання міратворчага патэнцыялу. Падрыхтавана аснова нарматыўнага афармлення партнёрства АДКБ з міжнароднымі арганізацыямі і трэцімі краінамі.

У цэлым у юбілейны для Арганізацыі год зроблена нямала, рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

— Далейшыя сумесныя дзеянні па ўмацаванні АДКБ захаваюць устойлівы, пастаупальны і дынамічны характар, — упэўнены беларускі лідар. На думку кіраўніка нашай дзяржавы, неабходна, каб гэта работа была ў полі дзеяння грамадскасці як нашых, так і замежных дзяржаў.

Старшынства ў арганізацыі пераймае Казахстан.

Пасяджэнне Савета калектыўнай бяспекі ў шырокім фармаце ўключала і ўрачысты момант. Сёлета 14 красавіка ў Бішкеку кіраўнікі дзяржаў прынялі сумеснае рашэнне аб узнагароджанні ганаровым знакам АДКБ першай ступені Мікалая Бардзюжы, які зрабіў значны ўнёсак ва ўмацаванне калектыўнай бяспекі і ў развіццё Арганізацыі. Мікалай Бардзюжа кіраваў АДКБ больш за 13 гадоў. Аляксандр Лукашэнка ўчора ўручыў яму названую ўзнагароду — яна, дарэчы, была ўручана ўпершыню ў гісторыі АДКБ.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

### У тэму

Выступаючы перад журналістамі, **генеральны сакратар Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы Юрый ХАЧАТУРАЎ** паведаміў, што ў сувязі з юбілейнай сесіяй Савет калектыўнай бяспекі прыняў Дэкларацыю кіраўнікоў дзяржаў — членаў АДКБ. У дакуменце адлюстраваны ўсе вынікі працы Арганізацыі за чвэрць стагоддзя.

— Падчас сесіі кіраўнікі дзяржаў абмяняліся меркаваннямі па шырокім коле актуальных тэм сусветнай і рэгіянальнай палітыкі, — сказаў Юрый Хачатураў. — Гэта, у прыватнасці, пытанні па ўрэгуляванні сірыйскага і нагорна-карабахскага канфліктаў. У сувязі з тым, што старшынства ў Арганізацыі перайшло да Казахстана, кіраўнік Казахстана аб'явіў прыярытэты дзейнасці АДКБ на 2018 год.

Па словах генсека АДКБ, на сесіі Савета калектыўнай бяспекі значная ўвага была нададзена ўмацаванню ваеннага супрацоўніцтва:

— План сумесных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы калектыўных сіл АДКБ у 2017 годзе выкананы на 100%. Акрамя таго, на тэрыторыі Таджыкістана мы правялі пазапланавыя буйнамаштабныя вучэнні з Калектыўнымі сіламі АДКБ. У цэлым ва ўсіх вучэннях за год на тэрыторыі Расіі, Арменіі, Казахстана, Таджыкістана ўзялі ўдзел больш за 12 тысяч чалавек, каля дзвюх тысяч адзінак тэхнікі, 140 лятальных апаратаў.

## УЛАДА ЗАЎСЁДЫ НА СУВЯЗІ

**Разбірацца ў камунальных, жыллёвых, дарожных і іншых набалелых пытаннях 2 снежня будуць прадстаўнікі абласных, гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў, а таксама кіраўнікі спраў. Патэлефанаваць чыноўнікам можна з 9 да 12 гадзін. Нагадаем, гарачыя лініі працуюць кожную суботу:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

першы намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8 021 222 22 22;

кіраўнік спраў ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;

кіраўнік спраў ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;

першы намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Алег Іванавіч ЧЫКІДА. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ. Тэл. 8 017 500 41 60;

старшыня МІНСКАГА гарадскога Савета дэпутатаў Васіль Васілевіч ПАНАСЮК. Тэл. 8 017 222 44 44.

■ Парламенцкі дзённік

# Канкрэтыка на Шаўковым шляху

### У Савеце Рэспублікі разгледзелі 14 пытанняў

**У парадку дня чарговага пасяджэння трэцяй сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі шостага склікання былі законапраекты, звязаныя з двухбаковымі міжнароднымі адносінамі, Нацыянальнай акадэміяй навук, ЕАЭС, Мэтамі ўстойлівага развіцця...**

Парламентарыі ратыфікавалі пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Беларуссю і Кітаем у рэалізацыі канцэпцыі будаўніцтва Эканамічнага пояса Шаўковага шляху. **Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАХМАНАЎ** адзначыў, што пагадненне вызначае канкрэтныя дэталі ўзаемадзеяння.

Ухвалены таксама змены ў Закон «Аб Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». У законапраекце ўдакладняюцца задачы, якія стаяць перад НАН, тлумачыць **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына СТАРАВОЙТАВА.** Гэта пытанні, звязаныя з маніторынгам расліннага і жывёльнага свету, а таксама з правядзеннем навуковых даследаванняў у касмічнай прасторы. Акадэмія навук і раней займалася гэтымі напрамкамі, але ў дадзеным законапраекце яны замацоўваюцца ў адзіным выглядзе.

Прагаласавалі сенатары і за змены ў Закон «Аб патэнтах на вынаходкі, карысныя мадэлі, прамысловыя ўзоры». «Гэта пытанне эфектыўнасці і якасці нашай даследчай дзейнасці ў розных сферах, — гаворыць Ірына Старавойтава. — Закон мае сур'ёзныя прагрэсіўныя рысы. Патэнтаўладальнікі цяпер змогуць атрымаць кампенсацыю ў выпадку парушэння іх правоў. І памер кампенсацыі будзе ад 1 да 50 000 базавых велічынь. Гэтая норма ўводзіцца ўпершыню.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

# Новыя крыніцы для падтрымкі АПК

### У Палаце прадстаўнікоў адбылося сумеснае пасяджэнне

**Учора дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу мелі магчымасць задаць пытанні членам урада на тэмы, якія іх хвалююць. Але асноўная — стан аграпрамысловага комплексу (АПК).**

**Міхаіл РУСЫ, намеснік прэм'ер-міністра Беларусі,** асобна спыніўся на праблеме стратных гаспадарак. Іх колькасць з пачатку 2017 года знізілася больш чым на 40%, але пытанне застаецца актуальным. Для падтрымкі такіх вытворчасцяў плануецца да канца года дапрацаваць указ па фінансавым аздараўленні сельгаспрадпрыемстваў. «Падрыхтаваны праект указа з асаблівым падыходам дасудовага аздараўлення гэтых гаспадарак, таму што тыповае банкруцтва і санацыя не зусім падыходзяць для вёскі», — растлумачыў віцэ-прэм'ер.

Усяго для працэдуры дасудовага аздараўлення было вызначана 323 прадпрыемствы, але пасля пераўтварэнняў такіх арганізацый стала 307. Па звестках за студзень—верасень, аднавілі плацежаздольнасць 40 арганізацый, палепшылі каэфіцыенты плацежаздольнасці 117, не змянілася сітуацыя ў 103 прадпрыемствах, пагоршылі каэфіцыенты плацежаздольнасці 47 арганізацый. У 102 арганізацыях будзе ўводзіцца антыкрызіснае кіраванне.

Для падтрымкі ўсяго АПК таксама распрацуюць дадатковую крыніцу льготнага крэдытавання комплексу. «З прычыны спецыфікі АПК, дзе абарачальнасць абаротнага капіталу складае звыш года, сельскагаспадарчыя арганізацыі непазбежна павінны прыцягваць крэдытныя рэсурсы», — адзначыў Міхаіл Русы. У якасці такога механізма можна будзе разглядаць магчымасць унясення ў статутны фонд ААТ «Белаграпрамбанк» мэтавых рэсурсаў. Кажучы пра крэдыты на рынкавых умовах, віцэ-прэм'ер адзначыў, што яны прыводзяць да нарошчвання запазычанасцяў і пагаршэння фінансавага стану гаспадарак.

Уладзіслаў Шчэпаў, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы, пацікавіўся ў віцэ-прэм'ера аб экспарце сельскагаспадарчай прадукцыі ў Расію, Вадзім Дзевятоўскі, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы, запытаў пра выкарыстанне пальмавага алею ў беларускіх сырах, што, як высветлілася, тлумачыцца іх фальсіфікацыямі, а Віктар Чайчыц, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, пацікавіўся станам развіцця фермерскіх гаспадарак у краіне.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Літва перадасць Украіне састарэлыя аўтаматы Калашнікава на два мільёны еўра

Улады Літвы адобрылі перадачу Украіне зброі, якую раней выкарыстоўвала мясцовая армія, якая цяпер перайшла на стандарты НАТА, паведамляе сайт Міністэрства абароны рэспублікі. У сувязі з гэтым перадаюцца аўтаматы, кулямёты, мінамёты, процітанкавая зброя, а таксама боепрыпасы да іх. Цяпер усё гэта літоўскім ваенным не патрэбна. Партыя ўключае больш за сем тысяч аўтаматаў Калашнікава і амаль два мільёны патронаў да іх, а таксама больш за 80 кулямётаў, некалькі дзясяткаў мінамётаў, процітанкавую зброю і іншую ваенную тэхніку.

Кошт зброі ацэньваецца ў 1,9 мільёна еўра. Пры гэтым сама Літва, набываючы яе, у свой час заплаціла больш за 3 мільёны еўра.

Кіеў атрымае зброю бясплатна. «Перадача ўзбраення з'яўляецца паслядоўнай і ўсебаковай падтрымкай Літвой Украіны ў мэтах узмацнення яе ўзброеных сіл і забеспячэння суверэнітэту сваёй дзяржавы», — заявіў міністр абароны Літвы Раймундас Кароблiс.

### Суд у Германіі вырашыў, што 96-гадовы «бухгалтар Асвенцыма» здольны чатыры гады пасядзець у турме

У Германіі былы ўнтэр-афіцэр СС 96-гадовы Оскар Гронінг, вядомы ў СМІ як «бухгалтар Асвенцыма», асуджаны за дапамогу і падбухторванне да забойства ў 300 000 выпадкаў, прызнаны судом здольным да адбывання чатырохгадовага турэмнага зняволення, паведамляе нямецкая газета Die Zeit. Найвышэйшы зямельны суд у горадзе Цэле ў федэральнай зямлі Ніжняя Саксонія вырашыў, што Гронінг можа адбыць гэты тэрмін, да якога яго прысудзіў суд у Люнебургу ў ліпені 2015 года. Былы эсэсавец знаходзіўся гэты час на волі, бо яго адвакат абскардзіў вердыкт суда.

Адвакат падсуднага заявіў Reuters, што той не выжыве ў турэмных умовах, і апратэставаў прысуд. Але сёлета ў жніўні экспертная медыцынская камісія прызнала Гронінга здольным да адбывання турэмнага тэрміну. Вывучыўшы меркаванні экспертаў, найвышэйшы зямельны суд вырашыў, што абвінавачаны павінен адправіцца для адбыцця турэмнага тэрміну, нягледзячы на свой узрост.

Гронінг працаваў у лагеры смерці з 1942 па 1944 гады. Тым не менш асноўныя абвінавачанні датычацца мая—ліпеня 1944 года, калі ў Асвенцыме знаходзілася 425 тысяч венгерскіх яўрэяў, 300 тысяч з якіх былі знішчаны ў газавых камерах. Калектыўны іск супраць Гронінга падалі 20 былых вязняў Асвенцыма і іх блізкія.

### Вучоныя вызначылі, хто разумнейшы — кошкі або сабакі



У сабак у два разы больш, чым у катоў, нейронаў у кары галаўнога мозга — вобласці, якая адказвае за мысленне, планаванне і складаныя паводзіны, устанавілі навукоўцы. Вынікі працы былі апублікаваныя ў часопісе Frontiers in Neuroanatomy.

Даследчыкі параўналі мозг некалькіх відаў жывёл, уключаючы катоў, сабак, ільвоў, бурых мядзведзяў, янотаў, тхароў. Як аказалася, у сабак у кары галаўнога мозга налічваецца каля 530 млн нейронаў, у той час як у катоў — толькі 250 млн (для параўнання, у кары чалавечага мозга каля 16 млрд нейронаў). На думку даследчыкаў, колькасць нейронаў менавіта ў гэтай вобласці вызначае здольнасць жывёліны рабіць вывады, зыходзячы з мінулага вопыту.

Зрэшты, на думку аўтараў працы, кошкі напэўна не дурныя, проста іх цяжэй вывучаць. Так, у пачатку 2017 года японскія вучоныя прыйшлі да высновы, што кошкі не дурнейшыя за сабак — яны здольныя запомніць тое, што з імі адбываецца, і пры неабходнасці «дастаюць» з памяці патрэбную інфармацыю.

■ Надвор'е

# Мокры снег і... холадна

**У першыя выхадныя каляндарнай зімы надвор'е будзе цёплае, але ветранае і з ападкамі, паведамілі спецыялісты ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўдзень умовы надвор'я на тэрыторыі Беларусі будуць вызначаць атмасферныя франты, не абыдзецца без ападкаў кароткачасовага характару. На асобных участках дарог — галалёдзіца. Месцамі, пераважна па поўначы краіны, чакаецца моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад нуля да плюс 5 градусаў, днём па паўднёвым усходзе павысіцца да 7 градусаў цяпла.

Чакаецца, што ў выхадныя дні надвор'е ў краіне будзе вызначаць вільготная паветраная маса, якая паступае з Балтыйскага мора. У нядзелю ў паўднёва-ўсходніх раёнах адаб'ецца ўплыў франтальнага падзелу. Тэмпературны фон крыху панізіцца, але застанецца вышэйшы за кліматычную норму. У суботу ўначы пераважна па паўночна-заходняй частцы, днём у асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным у выглядзе мокрага снегу. Месцамі чакаюцца слабая туман і галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў да плюс 1 градуса, удзень будзе знаходзіцца ў межах ад мінус 2 градусаў да 3 цяпла.

Уначы і раніцай у нядзелю чакаюцца слабая туман і галалёд. У асобных раёнах, пераважна па паўднёвым усходзе краіны, пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным мокры снег. На дарогах месцамі галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 да плюс 1 градуса, удзень — ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла.

Згодна з доўгатэрміновымі прагнозамі айчынных спецыялістаў, у панядзелак Беларусь у асноўным будзе знаходзіцца пад уплывам вобласці паніжанага атмасфернага ціску. Удзень адаб'ецца ўплыў франтальнага падзелу, які перамяшчаецца з Балтыйскага мора. Уначы ў асобных раёнах, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным снег і мокры снег. Таксама месцамі чакаюцца слабая туман і галалёд. На асобных участках дарог — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—6 марозу, удзень — ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# СЯБРОЎСТВА БЕЗ МЕЖАЎ

**У лютым 2018 года ў час правядзення XXV Мінскага міжнароднага кніжнага кірмашу-выставы адбудзецца Міжнародны сімпозіум літаратараў «Пісьменнік і час».**

На чацвёртую па ліку сустрэчу беларускіх і замежных пісьменнікаў збяруцца паэты, празаікі, публіцысты, перакладчыкі з розных краін свету. Ужо пацвердзілі свой удзел у сімпозіуме майстры прыгожага пісьменства з Азербайджана, Арменіі, Вялікабрытаніі, Казахстана, Кітая, Літвы, Латвіі, Малдовы, Пакістана, Расійскай Федэрацыі, Румыніі, Сербіі, Славакіі, Таджыкістана, Украіны, Эстоніі. Арганізатары творчага форуму — Міністэрства інфармацыі краіны, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Выдавецкі дом «Звязда», выдавецтва «Мастацкая літаратура» — мяркуюць, што да ўдзелу ў форуме прычыніцца і пісьменнікі з іншых дзяржаў. У час работы сімпозіума будуць абмеркаваны самыя актуальныя праблемы мастацкага перакладу, літаратурных і культурных сувязяў, прысутнасці і ролі пісьменніка ў грамадскім, палітычным жыцці.

Удзельнікі творчага форуму выступяць у студэнцкіх аўдыторыях, пазнаёмяцца з літаратурнай моладдзю Беларусі. Да сімпозіума выйдуць адмысловыя выпускі літаратурна-мастацкіх часопісаў з публікацыяй перакладаў твораў яго ўдзельнікаў.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# НА РАЗВІТАННЕ

Сумная вестка: не стала звяздоўца Івана Пятровіча МАКАЛОВІЧА.

Кароткія радкі біяграфіі: нарадзіўся ў 1940-м у вёсцы на Лунінеччыне, працаваў у калгасе, служыў у войску, скончыў універсітэт. Затым была праца ў рэдакцыі «Мінскай праўды», вучоба ў вышэйшай партыйнай школе, абарона кандыдацкай дысертацыі, амаль тры гады ўзначальваў ён «Звязду».

Іван Пятровіч кіраваў Саюзам журналістаў Беларусі, быў старшынёй дзяржаўнага камітэта па друку БССР, аўтар добрага дзясятка кніг, бацька двух сыноў...

Светлая памяць!


**ОАО «Белкард», г. Гродно, сдает в аренду по адресу: г. Гродно, ул. Курчатова, 1а:**

– административный корпус (2–6-й этажи общей площадью 2454 м²);

– производственный корпус площадью 485,7 м² ( смотровые ямы, г/п мех.);

– производственную площадь 3 985,2 м² (кран-балки г/п 2 т);

– производственную площадь 300,3 м² (вход изолирован от территории предприятия);

– производственную площадь 1712,7 м²;

– отдельные помещения в административно-бытовом корпусе (1-й этаж – 73,8 м²; 2-й этаж – 35,5 м²; 34,6 м²; 17,1 м²; 10,8 м²);

– столовую общей площадью 1484,3 м² (зал – 422,3 м²; кухонные помещения – 284,3 м²; холл – 175,6 м²; буфет – 97,8 м²; подвал – 504,3 м²).

За информацией обращаться по тел. 80152 52-16-14.

УНП 500013879


# СПРЫНТ У ЖОЎТЫМ БІПЕ

## Менавіта ў такім статусе — лідара — пачне сённяшнюю гонку Надзея Скардзіна ў шведскім Эстэрсундзе

**У індывідуальнай гонцы на 15 км яна ўжо прадэманстравала сваю стабільную стральбу (на чатырох агнявых рубяжах не дапусціла ніводнага промаху) і выдатнае перасоўванне па дыстанцыі. Надзея ўпершыню ў кар'еры атрымала перамогу на этапах Кубка свету і прысвяціла яе маме.**

*— Была занадта сканцэнтраваная на стральбе, разумела, што вельмі доўга знаходжуся на рубяжы, але хацелася «нуль». Для мяне на кожным старце важна добра страляць. Важней трапляць, чым страляць хутка, — такі ў мяне стыль стральбы. І я, вядома, здзівілася, калі даведалася, што іду першай. Была вельмі шчаслівай! Гэта падарунак маёй маме на дзень нараджэння (28 лістапада), —* расказала Надзея.



З перамогай біятланістку павіншаваў Прэзідэнт краіны. «Твой яркі поспех, дасягнуты дзякуючы працавітасці і волі да перамогі, падарыў усім беларусам выдатныя хвіліны радасці і гонару за сваю краіну. Гэта тваё першае золата на этапах Кубка свету, якое ўсяляе ў каманду надзею і ўпэўненасць у сваіх сілах у пачатку алімпійскага сезона», — гаворыцца ў віншаванні Аляксандра Лукашэнкі.

Прэзідэнт пажадаў Надзеі Скардзіна, яе калегам па зборнай і трэнерскаму штабу здароўя, поспеху і новых перамог.

Дар'я Домрачава ў індывідуальнай гонцы з трыма промахамі стала 14-й.

*— Тры промахі — гэта зашмат, але сезон толькі пачаўся, таму нічога страшнага. Спадзяюся, далей будзе лепш. Для мяне было важна зразумець, што я знаходжуся ў добрай фізічнай форме. Тое, што я страляла ў гэтай гонцы стабільна, — плюс, але трэба будзе над гэтым папрацаваць. Таксама пазітыўны момант у тым, што я паказала чацвёрты час ходу па лыжні, —* падкрэсліла Дар'я.

Сёння ў 19.45 адбудзецца жаночы спрынт, заўтра ў гэтым відзе праграмы выступяць мужчыны, завершыцца першы этап Кубка свету па біятлоне 3 снежня гонкамі пераследу.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Напярэдадні падзеі

# МАГЧЫМАСЦЬ УБАЧЫЦЬ УСЁ!

## Сёння ў Мінску стартуюць VII Міжнародныя гульні баявых майстэрстваў

**Буйны турнір пройдзе на чатырох арэнах сталіцы, у форуме прымуць удзел каля чатырох тысяч спартсменаў з 71 краіны, якія прадстаўляюць 15 напрамкаў адзінаборстваў. Найбольшая колькасць удзельнікаў у такіх папулярных відах, як тэхвандо ITF і каратэ. Беларускія атлеты заяўлены ў сямі відах адзінаборстваў.**

Каб атрымаць права правесці Міжнародныя гульні баявых майстэрстваў, краіне давялося выпрацаваць канкурэнцыю з боку Македоніі і Сербіі. Спецыяльная камісія наведала ўсе нашы спартыўныя аб'екты, убачыла інфраструктуру і на кангрэсе прыняла рашэнне арганізаваць форум у Мінску.

*— Баявыя майстэрствы дастаткова папулярныя ў нас у краіне. Традыцыйна асаблівая ўвага ўдзяляецца развіццю тэхвандо, каратэ, змешаных адзінаборстваў ММА, грэплінгу. У беларускіх аматараў спорту на Міжнародных гульнях баявых майстэрстваў будзе выдатная магчымасць убачыць розныя напрамкі, —* адзначыў **намеснік міністра спорту і турызму Беларусі Аляксандр БАРАУЛЯ.** *— З тэхнічнага пункту гледжання ўсё неабходнае абсталяванне ў нас ёсць: татамі, рынгі, даянгі. У гэтым кірунку аргкамітэт спрацаваў добра. Таксама вялікая колькасць удзельнікаў і гасцей — гэта яшчэ і праверка для нашых гасцінічных службаў перад другімі Еўрагульнямі, —* сказаў ён.

Прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі тэхвандо ITF прафесар Ры Ёнг Сон выказаў словы падзякі Мінспорту, Беларускай лізе тэхвандо за арганізацыю гульняў баявых майстэрстваў. *«Упэўнены, віды адзінаборстваў, якія будуць прадстаўлены ў Мінску, спадабаюцца гледачам. Міжнародная федэрацыя ўжо ацаніла падтрымку з боку журналістаў. СМІ актыўна асвятляюць ход падрыхтоўкі да гульняў, і для федэрацыі гэта вельмі важна», —* падкрэсліў кіраўнік.

Турніры па рукапашным баі, ММА, грэплінгу і арыенталу адбудуцца на «Чыжоўка-Арэне», па каратэ і панкратыёне — у палацы спорту «Уручча», па тэхвандо — на веладроме комплексу «Мінск-Арэна», а ў лёгкаатлетычным манежы БДУФК прадэманструюць сваё майстэрства прадстаўнікі муайтай, кунг-фу, кікбоксінга, джыу-джытсу і іншых відаў баявых майстэрстваў. Уваход на арэны — вольны.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*


**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Молодечноторг»**

Лот №1. Административное здание инв. №630/С-77906. Адрес: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 74Д. Назначение: здание специализированное для бытового обслуживания населения. Г. п. – 1996. Этажность – 1. Площадь общая – 81,7 м².
Земельный участок площадью 0,0555 га с кадастровым номером 642000000003000272.

**Начальная цена продажи – 66 000,00 бел. рублей, в т. ч. НДС 20%. Задаток – 4 000,00 бел. руб. Шаг аукциона 5%**

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) рабочих дней с назначенной даты проведения аукциона.
2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при подписании договора купли-продажи.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 4% (четырех процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 05.01.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
**Продавец:** ОАО «Молодечноторг», 222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Виленская, д. 201, УНП 600128795, тел. +375 (176) 73 73 14.
**Организатор аукциона**: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д.11, пом. 9, тел. 8 (017) 306-00-57.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже здания (Лот №1), принадлежащего ОАО «Молодечноторг», проводимом 5 января 2018 г.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 7. **Окончание приема заявлений:** 03.01.2018 г. в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта: Павлович Вадим Викторович, тел.: +375 29 114-96-68, +375 29 755-20-92, пн–чт с 8.00 по 17.00, пт с 8.00 по 16.00.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять Лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**


# Статус трэба ведаць

**З новага года ў краіне забяспечаць універсальны доступ да лячэння ВІЧ-інфекцыі — яно будзе прадастаўляцца ўсім без выключэння. З 18,8 тысячы выяўленых ВІЧ-інфіцыраваных пакуль толькі каля 10 тысяч, у тым ліку дзяцей, атрымліваюць антырэтравірусную тэрапію. Да канца наступнага года плануецца забяспечыць спецыфічным лячэннем усіх зарэгістраваных, якія трапілі на дыспансерны ўлік. 80 працэнтаў такіх лекаў — айчыннай вытворчасці. У хуткім часе перайсці на іх плануецца поўнасцю.**

36 млн чалавек, інфіцыраваных ВІЧ, жыве сёння на планеце. Колькасць людзей, якія штогод заражаюцца, за апошнія 15 гадоў скарацілася з 3 да 2 млн, а колькасць новых выпадкаў заражэння дзяцей, народжаных ад ВІЧ-станоўчых маці, знізілася напалову. У Беларусі ж з 2011 па 2016 год адзначаўся актыўны прырост новых выпадкаў, і толькі сёлета за 10 месяцаў паказчыкі былі роўнымі тым, што мелі месца ў 2016-м. Новыя выпадкі сярод дзяцей не з'яўляюцца, а таму іх колькасць паступова зніжаецца.

— Ранняя дыягностыка спрыяе больш эфектыўнаму лячэнню, павышае якасць жыцця і зніжае рызыку перадачы інфекцыі іншым людзям, — кажа **загадчыца аддзела прафілактыкі ВІЧ/СНІД Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ганна РУСАНОВІЧ.** — Наша краіна актыўна рэалізуе стратэгію дасягнення мэт 90-90-90, паводле якой 90 працэнтаў ВІЧ-станоўчых павінны ведаць пра свой статус, 90 працэнтаў тых, хто ведае, павінны атрымліваць лячэнне, і 90 працэнтаў тых, хто праходзіць лячэнне, павінны мець зніжэнне вірусная нагрузкі. Пры такім раскладзе ў папуляцыі зніжаецца распаўсюджванне інфекцыі, чалавек становіцца практычна бяспечным для навакольных і можа весці звыклы лад жыцця. У межах гэтай кампаніі актыўна ўкараняецца саматэставанне — экспрэс-тэсты па сліне можна набыць у аптэчнай сетцы Гомельскай вобласці, Мінска і Салігорска.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

# «КАЛІ ДАЧКА НА ЗМЕНЕ, ТАТА СТАРАЕЦЦА ЎДВАЙНЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Працоўная дынастыя Бабіновічаў пачалася яшчэ з бацькоў Уладзіміра. На трактарны завод яны ўладкаваліся ў 1950 годзе. Хоць самі не мінчане: ён — з Бярэзінскага раёна, яна — з Чэрвеньскага. Іх вёскі знаходзіліся побач. Але маладыя сяляне, як і многія ў той час, рваліся ў сталіцу. На заводзе яны пазнаёміліся, там жа і адпрацавалі да самай пенсіі. Бацька быў транспарціроўшчыкам у механічным цэху, а маці — кіроўцам электрапагрузчыка ў транспартным.

Уладзімір Уладзіміравіч на МТЗ прыйшоў у 1974 годзе, адразу пасля школы.

— Маці калісьці прывяла сюды, паказала, на чым катаецца, — я і загарэўся. Вось ужо 43 гады ў адным цэху працую: спачатку слесарам, потым акумулятаршчыкам, — падлічвае мужчына. — Увогуле заўсёды цікавіўся машынамі. Калі ў школу хадзіў, казаў усім: буду кіроўцам.

Таццянін працоўны шлях на заводзе пачаўся крыху пазней — у 1976-м. Сама яна з Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці. Пасля школы год адпрацавала ў ёй жа лабарантам і фізікам, бо настаўніка па гэтым прадмеце ў школе не было. Але да педагогікі душа не ляжала. Шукаць лепшай долі Таццяна паехала ў Мінск, паступіла ў БДУ.

— Але калі нас пасля першага курса сабралі і аб'явілі, што мы будзем настаўнікамі ў вёсцы, я адразу забрала дакументы і прыйшла на трактарны завод, — смяецца наша гераіня. — А куды было падацца? МТЗ быў самым папулярным заводам.

У аддзеле кадраў дзяўчыне далі накіраванне на канвеер. Праўда, пакуль яна праходзіла ўсе камісіі, работнікаў туды набралі. Таму Таццяну адправілі ў транспартны цэх. «Гэта нават лепш, — запэўнілі тады знаёмыя. — А то ад канвеера ты ні на крок не адыдзеш, а так хоць паездзіш па тэрыторыі».

За гэтыя гады Таццяна папрацавала на розных спецыяльнасцях: кіроўца электрапагрузчыка, тэхнік па ўліку гаруча-змазачных матэрыялаў, інспектар, старшы дыспетчар. Паралельна завочна скончыла Мінскі палітэхнікум.

— З чырвоным дыпломам, — удакладняе жанчына. — Як мяне з курсавым праектам ганялі! Казалі: «Не можа быць, каб жанчына на адны пяцёркі вучылася!»

## Кватэру будавалі ўласнымі рукамі

Раней у транспартным цэху жанчын было працэнтаў дзесяць. «Вядома, з боку мужчын шмат увагі, — прызнаецца Таццяна Мікалаеўна. — Мы так усе сябравалі. У сталовай калі адзін чалавек з нашай кампаніі чаргу заняў, натоўпам да яго далучаліся. І на танцы хадзілі — у асноўным у Парк імя 50-годдзя Вялікага Кастрычніка».

З будучым мужам Таццяна пазнаёмілася ў 1978-м.

— Я тады з арміі прыйшоў, зазірнуў у цэх з хлопцамі павітацца, — расказвае пра тую сустрэчу Уладзімір Уладзіміравіч. — Паглядзеў, што дзяўчына новая ў прыгожай хусцінцы ходзіць, з касой па пояс. Вырашыў, што будзе маёй. Праз два гады, у жніўні, мы ажаніліся.

— Першыя гады замужжа для мяне былі самыя цяжкія, — дзеліцца Таццяна Мікалаеўна. — Начальнік калоны пастаянна ставіў мяне ў трэцюю змену (гэта з 24 гадзін да сямі раніцы), каб дзяцей адразу не завяла *(смяецца)*.

Дэкрэтны ў тыя часы, дарэчы, быў удвая карацейшы — усяго паўтара года. Дзіцячы садок, куды Бабіновічы вадзілі сына і дачку, быў у суседнім доме — з пад'езда ў пад'езд толькі перабегчы. Чэргі ў сад, праўда, таксама былі. А колькі нерваў, каб уладкаваць дзіця ў групу! Але Бабіновічам пашанцавала: «выбіць» месцы ў садку дапамагла калега.

Кватэру сям'я атрымала ад работы. Амаль пяць гадоў работнікі самі дапамагалі гэты дом будаваць. Таццяна расказвае, што кожны будны дзень з чатырох да васьмі яны прападалі на будоўлі. І па выхадных ездзілі, а дзяцей летам на гэты час у вёску адвозілі. Потым пры размеркаванні кватэр гадзіны па будоўлі залічваліся: хто больш адпрацаваў, той і першы ў чарзе. З прэтэндэнтаў на трохпакаёўку Бабіновічы былі шостымі ці сёмымі.

— Цяпер рамонт распачалі: сваё агрэхі прыбіраем. Раўнуем сцены, якія самі клалі, — усміхаецца Таццяна Мікалаеўна.

— Спяшаліся, хацелі хутчэй засяліцца, — апраўдваецца Уладзімір Уладзіміравіч.

Ад завода Бабіновічы атрымалі ў свой час і лецішча непадалёк ад Кургана Славы, паміж Слабадой і Дамашанамі.

## Спартыўныя спаборніцтвы і паездкі за мяжу

Пара ўспамінае: у іх маладосці калектыў быў вельмі дружны. Самі суботнікі ладзілі, тэрыторыю завода прыбіралі. Потым начальнік цэха даваў аўтобус — усе ехалі ў лес на пікнік. Паездкі за мяжу арганізоўвалі. Былі ў Прыбалтыцы, адным летам тры разы ў Адэсе пабывалі. Карацей, ёсць, што ўспомніць.

Праводзілася шмат спартыўных спаборніцтваў: і лыжы, і крос, і спартыўнае арыентаванне. «Зімой, памятаю, мне на біятлоне пяць кругоў штрафных давялося ехаць, бо прамазала, калі страляла па мішэнях, — расказвае Таццяна. — Я і прызавыя месцы займала. Неяк за перамогу на кросе мне падарылі вадалазную маску з трубкай і ластамі».

Але і працаваць даводзілася немала. Між цэхамі ладзілі спаборніцтвы па паказчыках прадукцыйнасці, праўда, транспартны цэх, дзе працавалі Таццяна і Уладзімір, у іх не ўдзельнічаў, бо лічыўся не асноўным, а дапаможным. Муж і жонка, дарэчы, маюць званні ветэранаў працы.

Якія гады былі самымі цяжкімі?

— Па-мойму, такіх не было, — аптымістычна адказвае Уладзімір.



Брат з сястрой: Аляксандр і Надзея.


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Муж і жонка: Уладзімір Уладзіміравіч і Таццяна Мікалаеўна.

## Любая праца павінна паважацца

Прыкладна праз гадзіну са змены вызваляюцца Аляксандр і Надзея — дзеці Уладзіміра і Таццяны. Абое вырашылі працягнуць сямейную працоўную традыцыю. Хлопец трапіў на завод падчас практыкі ў каледжы. Выбраў месца работы па водгуках бацькоў. Таццяна Мікалаеўна ўзгадвае, як цішком прывяла шасцігадовага Сашу на экскурсію на завод.

— Тата яго на электракары па ўсіх цэхах абвёз, потым ён у мяне сядзеў і друкаваў. Ужо дадому ідзём, а на прахадной пытаюць: «Хлопчык, а ты адкуль?». Кажу сыну: «Бяжы!», — з усмешкай успамінае жанчына.

Аляксандр паспеў папрацаваць і на канвееры, і ў вытворча-дыспетчарскім упраўленні. Нават трактар вадзіць навучыўся: нейкі час спрабаваў сябе ў ролі абкатчыка. Цяпер працуе спецыялістам па продажах у гандлёвым доме МТЗ.

Яго сястра Надзея працуе ў транспартным цэху разам з бацькам. Адпраўляе трактарыстаў на лінію і выдае ім пуцёўкі. А пачынала кладаўшчыком: на завод дзяўчына прыйшла ў 18 гадоў.

— Захацела перайсці на свае грошы, каб і самой зручней было, і маме з татам лягчэй жылося, — тлумачыць яна сваё рашэнне. — Бацькі паклікалі да сябе пад крыло. Штосьці не ведала — званіла маме. А калі працую разам з бацькам на змене, заўсёды спакойна, што, прынамсі, электракарнае аддзяленне нас не падвядзе. Ведаю, што тата ўдвайне будзе старацца, калі дачка на змене *(усміхаецца)*. Увогуле, у нас на заводзе старэйшае пакаленне вучыць маладых.

Дома за вячэрай работу стараюцца не абмяркоўваць — каб мама Таццяна Мікалаеўна не перажывала.

Што цікава: і Надзея, і Аляксандр таксама сустрэлі сваіх палавінак на заводзе. Дзяўчына са сваім мужам працуе ў адным цэху, а хлопец пазнаёміўся з абранніцай на святкаванні Дня машынабудаўніка.

Ці не думала моладзь змяніць работу, паспрабаваць сябе ў іншай сферы?

— Не збіраюся пераходзіць, прывык. Дый многія сябры з каледжа тут засталіся, — адказвае Аляксандр.

— Шчыра, часам прыходзіла такое ў галаву, але бацькі на мяне ўскладаюць вялікія надзеі, таму не хочацца падводзіць. Мне тут камфортна: з людзьмі знаёмая, работу сваю ведаю, — дзеліцца Надзея. — Тое, што нехта лічыць, што працаваць на заводзе непрэстыжна, мяне ніколі не хвалявала. Я ведаю, як мае бацькі шчыравалі на гэтай вытворчасці. Любая праца павінна паважацца і цаніцца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*





**Проектная декларация**
**Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска» (во изменение и дополнение к ранее опубликованной декларации в газете «Звязда» от 29.01.2014 г. №16)**

Застройщик – коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом 27 февраля 2014 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №190580553.

Местонахожденит: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, пер. 4-й Загородный, 64а.

Тел./факс: 204-67-99, 256-64-18.

Притмное время – понедельник, среда 8.45 – 13.00; вторник, четверг 14.00 – 18.00, выходные дни: суббота, воскресенье.

В связи с корректировкой проектно-сметной документации по объекту: «Разработка комплексного архитектурного проекта жилой застройки с объектами инженерной инфраструктуры и улично-дорожной сети в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева в г. Минске. Микрорайон №4. 1-ая очередь строительства. Жилой дом №2.» (заключение государственной экспертизы от 24.02.2017 №629-15/13) для привлечения физических и юридических лиц предлагается к строительству по договору создания объекта долевого строительства административно-торговое помещение №1 общей площадью 102,23 кв. м.

Цена 1 кв. м общей площади помещения на дату опубликования проектной декларации сформирована в текущем уровне цен и составляет 1 650,00 руб.

Начало строительства – октябрь 2013 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию объекта – декабрь 2017 года.

С планировкой встроенного помещения и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, пер. 4-й Загородный, 64а, к. 102, тел. 256-64-18.

Для заключения договора необходимо:

– личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) того лица, с кем будет заключаться договор;

– быть готовым оплатить в течение 3 рабочих дней с даты получения договора полную стоимости объекта долевого строительства.

УНП 190580553

Центр Промышленной Оценки
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Извещение о проведении электронных торгов** | | | |
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
| **Продавец** | ОДО «Белавтозапчасть» Минская обл., г. Жодино, ул. Сухогрядская, д. 5, к. 3 | | |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф.4б | | |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** | | |
| **Предмет электронных торгов Месторасположение – Минская обл., г. Жодино, ул. Сухогрядская, 5б** | | | |
| Наименование (назначение) | | Общая площадь | Инв. номер |
| **Административно-бытовой корпус** (здание административно-хозяйственное) | | 2300,7 кв. м | 612/С-6109 |
| **Обременения:** Частичная аренда. Подробная информация на сайте www.cpo.by и www.ipmtorgi.by | | | |
| **Сведения о земельном участке** | общ. пл. 0,3497 га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования | | |
| **Начальная цена с учетом НДС 20% – 1 901 883,60 белорусских рублей. Шаг аукциона – 95 094,18 белорусских рублей** | | | |
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом электронных торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Ответственное лицо: Пинчук С. Н., контактный телефон +375 29 623 32 40 | | |
| **Задаток 1%** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов | | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | | | |
| Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати)** дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов | | | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | | | |
| Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона | | | |
| **Дата, время и место проведения электронных торгов: 03.01.2018 в 11.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Аккредитованному участнику,** подавшему в адрес организатора торгов пакет документов и прошедшему предварительную регистрацию, ЭТП предоставляется время до начала торгов в режиме реального времени для заключительной регистрации (начало заключительной регистрации за 2 часа до начала электронных торгов). В случае не прохождения регистрации участник к торгам не допускается. После прохождения регистрации участник получает доступ в аукционную комнату, где ожидает старта торгов в режиме онлайн | | | |
| **Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация): 28.12.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703** | | | |
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by | | |

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## Вольга СІЗОВА:

# «БОЛЬШ СУМНЫХ ЛЮДЗЕЙ, ЧЫМ АКЦЁРЫ, ЗНАЙСЦІ СКЛАДАНА»

### Ці прыйшлося жанчыне ахвяраваць асабістым жыццём дзеля кар'еры, што самае складанае ў рабоце акцёра і наколькі папулярны тэатр сёння

**Кар'ера актрысы Вольгі Сізовай пачалася вельмі ярка, яе першая вялікая і запамінальная роля здарылася, калі студэнтцы першага курса тэатральнага інстытута было ўсяго 16. Кінадэбют адбыўся ў фільме Мікалая Засеева «Дарога ў пекла», на здымачнай пляцоўцы гэтай карціны Вольга працавала побач з такімі вялікімі акцёрамі, як Людміла Гурчанка, Уладзімір Коранеў, Сцяпан Старчыкаў і іншыя. У няпростых 90-х Сізова на ўласнай персоне адчула ўсе змены не толькі ў грамадстве, але і ў кіно. Сёння яна адна з вядучых актрыс Тэатра-студыі кінаакцёра, за плячыма Вольгі дзясяткі роляў у расійскіх серыялах.**

— У Тэатры-студыі кінаакцёра занятасць у мяне даволі вялікая, на дадзены момант іграю ў спектаклях — «Механічны чалавек», «Выкраданне Алены», «Поле бітвы», «Хто смяецца апошнім», «Рабаванне апоўначы», «Дзве стралы» і, як заўсёды перад новым годам, у «Шчаўкунку», — расказвае Вольга. — Наогул звычайна спектакль ідзе па годзе, два, а потым зжывае сябе, становіцца нецікавым, а ў нас у тэатры спектаклям па 15—20 гадоў, і ўсё роўна яны збіраюць аншлагі. Мабыць, сакрэт у тым, што мы выбіраем жыццёвыя тэмы, якія заўсёды застаюцца актуальнымі.

***— Але ж за гады мяняюцца людзі, і артысты на герояў, якіх іграюць, з цягам часу могуць глядзець па-іншаму?***

— Вядома, адна справа, калі я іграла Алену (у спектаклі «Выкраданне Алены»), калі толькі прыйшла ў тэатр у 25 гадоў, і іншая цяпер, калі мне 47. Ужо зусім іншая Алена. Але, калі я, напрыклад, іграю ў французскай камедыі, то не магу надзяляць гераіню сваімі розумам і досведам, таму што яна патрабуе лёгкасці. Сталеем мы, сталее і спектакль, іншае пытанне, што цяжка столькі гадоў знаходзіць натхненне, каб выходзіць на сцэну соты раз і выдаваць сапраўдныя эмоцыі.

***— Якому гледачу пашанцавала больш: таму, хто прыйшоў на спектакль у першыя месяцы пасля прэм'еры, або таму, хто бачыць ужо шмат разоў сыграную пастаноўку?***

— Цяжка адказаць, таму што нават крытыкі прыходзяць на спектакль некалькі разоў — спачатку на прэм'еру, а потым на 10—15-ы спектакль, гэта прыкладна праз паўгода — год. Калі ён ужо выстаяўся, прыйшоў у форму. Колькі б не іграў на сцэне, а я раблю гэта ўжо гадоў 30, хваляванне ёсць заўсёды. Акцёрская прафесія такая, што, хоць ты прызнаны народны артыст, усё роўна прыходзіш у новы спектакль і даказваеш свой прафесіяналізм, паказваеш, што ўмееш.

***— Іграючы на сцэне, сочыце за рэакцыяй гледачоў у зале?***

— Вядома, і часта бачу, што мужчыны, якіх у асноўным прыводзяць жонкі, спачатку сядзяць з абыякавымі тварамі, а заканчваюць глядзець некаторыя пастаноўкі са слязамі на вачах. Хтосьці разумее, што жыццё пражывае не так, няправільна, а хтосьці, наадварот, дзякуючы нашай рабоце на сцэне і вобразам, якія мы перадаём, думае, якое шчасце, што я жыву так, як жыву.

***— На ваш погляд, наколькі сёння папулярны тэатр?***

— Вельмі папулярны. Людзям ён неабходны. Мы ж перажывалі розныя часы, калі ў людзей і на ежу грошай не было, а яны ўсё роўна прыходзілі ў тэатр. І зараз не самы просты час, але залы ў нас забітыя, таму кожны раз выходжу і дзякую гледачам за тое, што прыйшлі. Кіно можна паглядзець і дома, а адчуць гэтую атмасферу, абмяняцца з акцёрамі энергетыкай — кіно гэта не заменіць. Нават калі дзяцей са школ прыводзяць паглядзець пастаноўкі па творах, якія ўваходзяць у школьную праграму, я бачу, што яны не расчароўваюцца ў тэатры, а зацікаўліваюцца ім.

***— Ці сутыкаліся вы з некарэктнымі паводзінамі з боку гледачоў?***

— Ніколі. У нас ёсць спектакль «Поле бітвы», рэжысёр паставіў у ім апарт, гэта значыць я пераключаюся на зал і пачынаю з імі працаваць, звычайна выбіраю аднаго мужчыну і размаўляю менавіта з ім. Пасля гэтага часта атрымліваю кветкі ад гэтых выбраных людзей, яны ідуць у буфет і перадаюць мне шампанскае, цукеркі *(смяецца)*. Адзіная праблема ў нас — гэта тэлефоны. Пяць разоў перад пачаткам просяць іх адключыць, але заўсёды знойдзецца адзін, хто гэтага не зробіць.

***— Ваша кінакар'ера пачалася даволі рана.***

— Да паступлення ў інстытут я год займалася ў тэатральнай студыі Таліпава, у якога потым іграла ў тэатры. Наогул, па расказах думала, што ў тэатральны з першага разу не паступаюць, таму ведала, што калі ў мяне таксама не атрымаецца адразу, пайду на біяфак і спрабаваць больш не буду, але мяне ўзялі.

У Савецкім Саюзе было прынята, што кожнае лета студэнты з тэатральных ВНУ Масквы, Мінска, Піцера і іншых гарадоў збіраліся на тэатральным фестывалі. Пасля майго першага курса ён праходзіў у Кіеве, куды я і адправілася. У адзін з вольных дзён з аднакурсніцамі вырашылі пайсці на кінастудыю Даўжэнкі, каб пакінуць там сваё рэзюмэ, стаць на ўлік. У той момант на месцы не было фатографа, а свае фотакарткі пакінуць трэба, таму адміністратар прапанавала нам пайсці на кастынг Засеева ў карціну «Дарога ў пекла», які якраз праходзіў у той час на студыі. Схадзілі. Літаральна праз тыдзень мне прыходзіць тэлеграма: «Выклікаем на пробы на галоўную ролю». Шчаслівая паехала ў Кіеў, а праз два—тры тыдні даведалася, што мяне зацвердзілі.

***— Тады ў вас зусім не было вопыту, прыйшлося цяжка?***

— Так, у мяне была роля наркаманкі, якая памірае. Каб сыграць гэта, вазілі ў бальніцу, таму што я, натуральна, не ведала, як там, што адбываецца ў такіх людзей. Пазней хуткая дапамога дзяжурыла на здымачнай пляцоўцы ўжо для мяне, таму што на той момант я не магла правільна размеркаваць свае эмоцыі. За тры месяцы эмацыянальна была знясіленая цалкам.



Спектакль «Выкраданне Алены».

Пасля праекта «Дарога ў пекла» было яшчэ пару работ, а потым пачаліся 90-я. Як кажуць японцы ў сваім самым страшным праклёне: «Дай бог жыць у эпоху перамен». Прыкладна так і атрымалася ў нашым жыцці. Многія кінастудыі тады разваліліся, акцёры прапалі. У мяне з'явіліся камерцыйныя праекты, а потым і серыялы.

***— Сёння ў серыялах вы здымаецеся дзеля грошай або прафесійнага задавальнення?***

— І каб грошы зарабіць, і для таго, каб форму не губляць. У мяне ўжо столькі работ у серыялах, што дакладную лічбу назваць не змагу. Але калі хтосьці думае, што гэтыя здымкі простыя — не. Напрыклад, дзве серыі «Дарогі ў пекла» мы здымалі чатыры месяцы, а цяпер чатыры серыі здымаюцца за 15 змен, адна змена доўжыцца 12 гадзін. Пачынаеш раніцай, заканчваеш позна вечарам, а табе яшчэ пасля гэтага даюць стос тэксту, з ім трэба папрацаваць, а ў сем раніцы зноў выходзіць на пляцоўку. Бывае, у адзін дзень мы здымаем кадр з першай серыі, кадр з чацвёртай серыі і яшчэ з якой-небудзь, таму трэба хутка здолець перагрыміравацца, бо ў адной серыі ты плачаш, а ў другой — ідзеш у рэстаран. Нікога не хвалюе, як ты будзеш з гэтым спраўляцца, ніхто не будзе цябе вучыць, калі не паспяваеш — да пабачэння.

Няхай, як некаторыя кажуць, мы здымаем серыялы для бабуль, але асабіста па сабе і гледзячы, як працуюць калегі, абсалютна шчыра скажу: усе аддаюцца на 100%.

***— Акцёр звычайна можа вылучыць любімыя і нелюбімыя ролі?***

— Думаю, не. Не можа быць такога паняцця, таму што нават калі ў цябе маленькая сцэна, то за час работы з тэкстам, рэпетыцый укладваеш у яе вельмі шмат. Фаіна Ранеўская не сыграла ніводнай галоўнай ролі, яна выходзіла, казала два словы і зрывала вяршкі, у той час, як выканаўцы галоўных роляў рвалі на сабе кашулю.

Я ў сваім жыцці перайграла шмат таго, што мне хацелася, і таго, чаго не хацелася. Вельмі люблю свае камедыйныя ролі, калі людзі смяюцца — гэта выдатна, і вельмі люблю, калі гледачы плачуць, пражываючы са мной ролю.

Наогул, толькі ў акцёрстве можна паспрабаваць сябе ў розных прафесіях. Часам мне задаюць пытанне: ці не шкадую я, што выбрала гэтую працу? А як можна шкадаваць аб пражытым жыцці? Вядома, яна складаная, чаму ў акцёраў часта здараюцца інфаркты і інсульты, — ты эмацыянальна аддаешся прафесіі. Часта яшчэ чую, што з актрысамі цяжка будаваць сямейнае жыццё, але паверце, я столькі нагуляюся ў тэатры, што ў жыцці з мяне актрыса горшая за любую жанчыну з крамы. Наогул, больш сумных людзей, чым акцёры, знайсці складана.

***— Акцёра заўсёды ацэньваюць, выбіраюць, гэта пэўная залежнасць...***

— Я і сёння з гэтым не змірылася. Усё роўна, наколькі высокі ў цябе прафесіяналізм, як ты сыграў свае мінулыя ролі. Табе даюць тэкст, ты ўсё роўна ідзеш на кастынг, пробы, і так зноў і зноў. Ты проста можаш не падыходзіць вонкава ці элементарна не падабацца рэжысёру, і ўсё, цябе не возьмуць. Калі толькі прыйшла ў прафесію, не была да гэтага гатовая, і сёння бывае балюча і крыўдна, напэўна, такое ўжо ніколі не пройдзе.

***— Ці даводзілася вам дзеля кар'еры ахвяраваць сваім асабістым жыццём?***

— Не сказала б. Хоць у мяне двое дзяцей, але ў дэкрэце я не была ні аднаго дня, іграла на сцэне да 7—8 месяцаў, сыходзіла і ўжо праз тыдзень пасля родаў вярталася альбо на сцэну, альбо на здымачную пляцоўку. Сваю старэйшую дачку я нарадзіла ў 28, на той момант ужо не была замужам і пакідаць яе мне не было з кім, таму вялікую частку часу дзіця праводзіла ў тэатры. Я выходзіла на сцэну, а яе вось тут, каля тэатра каталі ў калясцы. Тады не было машыны, таму пасля спектакля ішла на Нямігу на тралейбус, каляску на сцягно і ехала дадому. Затое дачка ўвесь час была са мной і ўвагі ёй хапала. Другую дзяўчынку я нарадзіла таксама позна — у 36 гадоў. Тут ужо дапамагала старэйшая, з'явіліся няні. Цяпер наогул няма праблем нарадзіць і працягнуць развівацца ў сваёй прафесіі, ды і тады ў мяне такі выбар не стаяў. І мужчыны не было, які паставіў бы мяне перад дылемай — ён ці тэатр, атрымаў бы адназначны адказ — тэатр!

***— Хтосьці з дачок пойдзе па вашых слядах?***

— Яны ў мяне абсалютна дзве розныя дзяўчынкі. Старэйшая вучыцца на факультэце міжнароднай журналістыкі, а малодшай зараз усяго 11 гадоў, але яна вельмі цікавы чалавек, ніколі ў мяне не глядзела мульцікі, а любіла перадачы Animal Planet пра жывёл. У дзяцінстве цвёрда заяўляла, што будзе ветэрынарам, у тры гады сказала: «Мама, я не ем трупаў», і з таго часу з'яўляецца поўнай вегетарыянкай.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*


**«ЗВЯЗДОЎСКІЯ» ПАДАРУНКІ ДЛЯ ВАШЫХ ПАЧАСТУНКАЎ!»**

Калі вы падпісаліся на «Звязду» на I квартал або на I паўгоддзе 2018 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 студзеня 2018 года на адрас рэдакцыі:
г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў 17 студзеня 2018 года будуць разыграны 7 мікрахвалёвых печак Horizont, а таксама суперпрыз — газавая пліта Gefest. Вынікі розыгрышу прызоў будуць апублікаваны да 27 студзеня 2018 года ў газеце «Звязда». Прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін па 31 сакавіка 2018 года. Пасля гэтай даты выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на I квартал ці I паўгоддзе 2018 года.

Тэрмін правядзення рэкламнай гульні — з 1 снежня 2017 года па 31 сакавіка 2018 года. Умовы апублікаваны ў нумары 231 ад 30 лістапада 2017 года.

Даведкі па тэлефонах: (017) 337 44 04, 287 17 40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №3164 ад 28.11.2017 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.



Horizont 20MW700—1378AAW



ПЛІТА ГАЗАВАЯ GEFEST 5100-02 T2 K

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або I паўгоддзе 2018 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

____________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)

на I квартал або I паўгоддзе 2018 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) ________ (індэкс) ________

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!


## Падпіска-2018

### «Ты адно запомні, браце, са «Звяздой» цяплей у хаце!»

Прызнаў гэта адзін з нашых падпісчыкаў. І, вядома ж, не памыліўся. Проста час (а ён гэта можа!) уносіць свае карэктывы: у прыватнасці, са «Звяздой» у новым 2018-м будзе не толькі цяплей, але і... смачней. Што цалкам лагічна, бо сярод прызоў для адданых і новых падпісчыкаў — новая газавая пліта і сем мікрахвалёвых печак.

Для таго каб выйграць іх — «Звяздоўскія» падарункі для сваіх пачастункаў!» (падрабязная інфармацыя ў нумары за 30 лістапада), — дастаткова аформіць падпіску на першы квартал альбо першае паўгоддзе, а потым запоўніць і даслаць у рэдакцыю картку ўдзельніка рэкламнай гульні.

Розыгрыш прызоў адбудзецца 17 студзеня.

***Дарэчы, падпіска на «Звязду» можа стаць добрым навагоднім падарункам для вашых блізкіх.***

## Серада, 6 снежня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.15** Зона Х (16+).
**9.10, 22.10 Серыял «След» (16+).**
**10.55, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Забудзь і ўспомні» (16+).**
**13.10** «Дзіцячы доктар».
**13.40** «Дзень у вялікім горадзе».
**14.45, 15.25 Серыял «Райскае месца» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**21.50** «Актуальнае інтэрв'ю».
**0.00** Сфера інтарэсаў.
**0.55** «Дзень спорту».
**1.10 Серыял «Афіцэрскія жонкі» (16+).**

### Беларусь 2

**7.00** «Тэлераніца» (12+).
**9.00, 19.15** «Тэлебарометр».
**9.05, 17.05 Серыял «Жаночы рай». Заключныя серыі (16+).**
**11.05** «Тата зможа?» (16+).
**12.05 Серыял «Каманда» (16+).**
**14.05** «Бітва салонаў» (16+).
**15.15 Серыял «Іх пераблыталі ў раддоме» (16+).**
**16.15** «Нічога сабе ньюз» (12+).
**16.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**19.25** Баскетбол. Кубак ФІБА. «Цмокі-Мінск» (Беларусь) — «Альба» Венгрыя.
**21.30** «Багіня шопінгу» (16+).
**22.00** «Спортлато 5 з 36», «КЕНО».
**22.05** «Калі мы дома». Скетчкам (16+).
**22.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 6-ы тур групавога раўнда. «Ліверпуль» (Англія) — «Спартак» (Расія).
**0.50** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 6-ы тур групавога раўнда. Агляд гульнявога дня.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Халадзец з рыбы.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15** «Гэты дзень».
**8.25, 18.30 «Пётр Лешчанка. Усё, што было...» Маст. фільм (16+).**
**9.25, 17.50** «Апошні дзень». Ралан Быкаў (12+).
**10.05** «Святло далёкай зоркі». Памяці доктара мастацтвазнаўства, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Зінаіды Мажэйка.
**10.30** «Эпоха Максіма Багдановіча».
**11.00** «Тры талеры». Маст. фільм (6+).
**12.20** «Старыя казкі».
**12.45** «Сінематэка». Беларускія фільмы 40—50-х гадоў.
**13.25** «Знакі лёсу. Віктар Казько». Дак. фільм (12+).
**13.50 «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял (16+).**
**15.30, 21.05 «Дзяржаўная граніца». Маст. фільм «Мірнае лета 21 года» (12+).**
**19.25** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**20.10** «Беларуская кухня». Пернік з макам.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.25** «Песні пад гітару».

### Беларусь 5

**8.00** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/4 фіналу. 1-ы матч. «Ліберэц» (Чэхія) — «Цюрых» (Швейцарыя).
**9.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 6-ы тур. «Чэлсі» (Англія) — «Атлетыка» (Іспанія).
**11.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 6-ы тур. Агляд гульнявога дня.
**12.55, 17.15** Спорт-мікс.
**13.05** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны. +105 кг.
**14.45** Легенды спорту: беларускія гісторыі. А. Герасіменя.
**15.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 6-ы тур. «Манчэстэр Юнайтэд» (Англія) — ЦСКА (Расія).
**17.25** Козел пра футбол.
**17.45** Слэм-данк.
**18.20** Агнявы рубеж.
**18.50** Хакей. КХЛ. «Нафтахімік» (Ніжнякамск) — «Дынама-Мінск». (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**21.15** Футбол. Клубны чэмпіянат свету. «Аль-Джазіра» — «Окленд Сіці».
**22.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 6-ы тур. Анлайн гульнявога дня. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Арцем'еў у яго фантастычным свеце» (12+).
**10.00** «Жыць здорава!» (12+).
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.20, 13.10, 19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20** «Адваротны адлік». «Дызайн па-савецку: ад шклянкі да БелАЗа» (12+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Другі зрок». (16+).**
**23.05** «Вячэрні Ургант» (16+).
**23.45** Начныя навіны.
**0.00** «Час пакажа» (16+).

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10. 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 18.35** «Тайны Чапман».
**9.35, 23.05** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**10.40, 23.55 «Дэпартамент» Серыял (16+).**
**12.30, 23.25** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**13.50 Маст. фільм «Мексіканец». (16+).**
**16.10** «Аўтапанарама» (12+).
**16.50 «Салдаты і афіцэры». Серыял (16+).**
**17.35 «Разведчыцы». Серыял (16+).**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Камедыя «Каханне і іншыя непрыемнасці». (16+).**
**22.00** «Глядзець усім!» (16+).
**1.40** Eric Clapton: Фестываль гітарнай музыкі «Скрыжаванні». 1-я частка (16+).

### МІР

**7.30** «Добрай раніцы, свет!» (16+).
**8.35** «Няма праблем» (16+).
**10.00** «Любімыя акцёры» (12+).
**10.30, 13.15, 19.20 Серыял «Маша ў законе» (16+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**14.25** «Іншы свет». Як развіць свой бізнес? (12+).
**15.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 18.05, 4.45 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**21.15 Серыял «Аддзел 44» (16+).**
**23.10 Маст. фільм «Пізанская вежа» (16+).**
**1.05 Маст. фільм «Развітальная гастроль Артыста» (0+).**
**2.55 Серыял «Мафіёза» (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
**12.00, 22.10, 23.10 Серыял «Свая чужая». (16+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**20.35 Серыял «Марозава». (12+).**
**23.55 Серыял «Правакатар». (16+).**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**7.50, 8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**9.40, 23.30** «НЗ.by».
**10.25 Серыял «Падазраюцца ўсе». (16+).**
**11.05 Серыял «Сведкі». (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных». (16+).
**13.30, 18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.10 Серыял «ППС». (16+).**
**16.30** «Спецыяльны выпуск». (16+).
**17.30 Серыял «Мянтоўскія войны». (16+).**
**19.40 Серыял «Чужы твар». (16+).**
**21.30 Серыял «Шэлест».**
**23.50** «Вынікі дня».
**0.20 Серыял «Версія». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.45, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.25, 16.00** Для дзяцей «Адказвайка».
**7.30** Раніца на восьмым.
**10.30** «Адшукваецца адпачынак» (0+).
**11.00 Драма «Апошняя дуэль» (16+).**
**13.00 Серыял «Жорсткае каханне».**
**14.25 Серыял «Прыгоды маладога Індыяны Джонса».**
**16.05** «Мультпарад»: «Чыпаліна».
**17.20 Серыял «Сталічны дом».**
**18.30 Серыял «Даверяю табе».**
**19.15** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**19.50 Серыял «Свой сярод чужых».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Трылер «Падзенне» (18+).**
**23.00** «АртЛайт».
**23.15 Серыял «Каханне каля возера».**

### ВТБ

**6.00, 15.15** Серыял «Вароніны». (12+).
**7.20** «Дурні і дарогі». (16+).
**7.40, 4.20** М/ф «Дуда і Дада». (0+)
**8.00, 4.30** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.20, 4.50** М/ф «Аліса ведае, што рабіць!» (6+)
**8.50, 3.50** «Ералаш». (6+)
**9.30** Серыял «Сямейны бізнес». (12+).
**10.40** Камедыя «Прывітанне, мы ваша «крыша»!» (12+).
**12.40** Скетч-шоу «6 кадраў». (16+).
**13.00, 19.00** Серыял «Псіхалагіні». (16+).
**14.10, 20.10** Серыял «Атэль «Элеон». (16+).
**16.45, 5.10** Серыял «Ранеткі». (12+).
**17.50, 23.20** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.20** Камедыя «Бармэн». (16+).
**0.00** Серыял «Васьмідзясятыя». (16+).
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**1.50** Серыял «Закрытая школа». (16+).
**3.30** «Лаві момант». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** Пернікавы домік. «Когда б вы знали, с какого сора...»
**7.05** «Легенды сусветнага кіно». Сяргей Гурзо.
**7.35** «Пешшу...» Масква гатычная.
**8.05, 21.10** «Правілы жыцця».
**8.35, 22.15** «Абацтва Даўнтан». Маст. фільм.
**9.25** «Сакрэты старых майстроў». Абрамцава.
**9.40** Галоўная роля.
**10.15, 17.45** «Назіральнік».
**11.15, 14.10, 17.10** XVIII Міжнародны тэлевізійны конкурс юных музыкаў «Шчаўкунок». Другі тур.
**13.20, 20.05** «Бляск і слава Старажытнага Рыма». Дак. фільм. 1-я серыя.
**16.25** «Расія, любоў мая!» «Свяшчэнны гай марыйцаў».
**16.55** Колер часу. Эдвард Мунк. «Крык».
**19.10** Важныя рэчы. «Бюст Пабеданосцава».
**19.45** Галоўная роля.
**20.55** «Добрай ночы, малыя!»
**21.40** «Абсалютны слых».
**23.10** Урокі рускай. Чытанні. І. Тургенеў. «Вершы ў прозе». Чытае Станіслаў Гаварухін.
**23.55** 90 гадоў Уладзіміру Навумаву. «Маналогі кінарэжысёра». Дак. фільм.
**0.40** Дакументальная камера. «Забытая мова нямога кіно, або Наперад, да вытокаў!»
**1.20** Гістарычныя канцэрты. Фестываль «Снежаньскія вечары».
**2.15** «Паскарэнне. Пулкаўская абсерваторыя». Дак. фільм.
**2.40** «Pro memoria». Хоку.

### Настальгія

**6.00** Тэлефільм «Дзень на дваіх». (16+).
**7.55, 8.40, 9.40, 11.00, 13.05, 14.35, 15.40, 17.00, 20.10, 21.40, 23.00** Музычная настальгія (12+).
**8.30** «Час пік» з Андрэем Разбашам. 1995 год (12+).
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.15** Тэлефільм «А. П. Чэхаў. Сцэнкі». (16+).
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Піянеры шоу-бізнеса». 2005 год (16+).
**13.30** Маст. фільм «Жыў-быў наладчык». (16+).
**18.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
**19.05** Маст. фільм «Дробязі жыцця». (16+).
**20.30** «Час пік» з У. Лісцьевым. 1995 год (16+).
**0.00** Вечар Васілія Ланавога ў Канцэртнай студыі «Астанкіна». 1983 год (12+).
**1.45** Фільм-канцэрт «Бенефіс Савелія Крамарава». 1974 год (12+).
**2.35** «Замежная эстрада». 1988 год (12+).
**3.55** Маст. фільм «Уяўны хворы». (16+).

### EuroSport 1

**3.00, 7.30, 19.30** Лыжнае двая-борства. Кубак свету.
**3.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**5.00, 9.00, 14.35, 16.00, 22.00** Снукер. UK Championship.
**6.30, 1.35** Watts.
**8.00, 20.00** Біятлон. Кубак свету.
**10.30** Аўтагонкі. «Формула Е».
**11.30, 20.30, 2.30** Зімовыя віды спорту. Sports destination.
**12.00** Алімпійскія гульні. «Алімпійскія рэкорды».
**13.00** Алімпійскія гульні. «Гонка тэхналогій».
**14.00, 2.55** Аўтагонкі. Серыя WTCC.
**20.25** Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй». Ліндсі Вон.
**21.00** Дрон-рэйсінг. DR1 Champions.

### Кінакамедыя

**0.55** Камедыя «Уцекачы». (12+).
**2.50** Камедыя «Без меж». (12+).
**4.50** Меладрама «Увесь гэты джэм». (12+).
**6.20** Камедыя «Ліхтугі Альфрэда». (12+).
**8.10** Камедыя «Маёмасць з хвастом». (12+).
**10.00** Камедыя «}{отт@бь)ч». (16+).
**11.50** Камедыя «Паміж анёлам і чортам». (16+).
**14.00** Камедыя «Аперацыя «Тушонка». (16+).
**16.00** Камедыя «Прыдуркі». (16+).
**17.40** Камедыя «Душэўная кухня». (16+).
**19.30** Камедыя «Часова цяжарная». (16+).
**21.15** Камедыя «Палавое выхаванне». (18+).
**23.00** Меладрама «Чаго хочуць жанчыны?» (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.50** «Доктар І...» (16+).
**8.20** «Трэндзі» (16+).
**8.50, 19.00, 3.05** «Кузей. Гюней». Серыял (16+).
**10.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.05, 18.00** «Сляпая» (12+).
**13.05, 16.55** «Варажбітка» (12+).
**14.10, 4.40** «Паралельны свет» (12+).
**15.05** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**15.40** «Здзелка» (16+).
**16.10** «Натуральны адбор» (12+).
**20.55** «Магазіна» (16+).
**22.00** «Рэвізора» (16+).
**23.05, 5.30** «Лінія абароны» (16+).
**23.40** «Візіцёры». Серыял (16+).
**0.25** «Ілюзіяніст». Драма (16+).
**2.15** «Гучныя справы» (16+).

### ТБ1000

**6.10, 18.05** Назад у будучыню II (6+).
**8.15** Адна сустрэча (16+).
**9.50** Не ў сабе (16+).
**12.05** Знесеныя ветрам (12+).
**16.05** Дзённікі нянькі (16+).
**20.10** Маст. фільм «Дасканалы свет» (16+).
**23.00** Маст. фільм «Помста ад куцюр» (16+).
**1.30** Страчаны рай (18+).
**3.55** Пабочны эфект (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Брат (16+).
**8.20** Усё пра мужчын (16+).
**10.20** Анёл (12+).
**12.15** Зорка чароўнага шчасця. Серыя 1 (16+).
**14.00** Зусім не простая гісторыя (16+).
**16.20, 4.20** Спяшайцеся кахаць (12+).
**18.20** Наша Russia. Яйкі лёсу (16+).
**20.20** Танцы насмерць (12+).
**22.20** Брат-2 (16+).
**0.50** Чалавек ля акна (12+).
**2.45** Хутчэй за трусоў (16+).

### National Geographic

**6.00** Узлом сістэмы. (16+).
**6.25** Зрабі або памры. (12+).
**6.50** Займальная навука. (12+).
**7.40, 5.35, 9.35, 5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**8.05, 10.20** Мегазаводы. (12+).
**8.50, 11.10** Шаша праз пекла. (12+).
**11.55, 17.10, 20.20** Аўта-SOS. (12+).
**12.40** Навука будучага Стывена Хокінга. (12+).
**13.25** Гульні розуму. (12+).
**15.00** Смага. (16+).
**15.40** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха. (12+).
**16.25, 19.35, 0.05, 2.30** Расследаванні авіякатастроф. (12+).
**18.00, 21.05, 0.50, 3.55, 4.00** Дзікі тунец (12+).
**18.45, 22.40** Пачатак. (12+).
**21.50, 1.45, 4.50** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала. (16+).
**23.20** Другая сусветная вайна: пекла пад вадой. (16+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары. (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 6.20** Як гэта ўстроена? (12+).
**10.00, 16.00** Склады: бітва ў Канадзе. (16+).
**10.30, 16.30, 23.00, 3.50** Паляўнічыя на склады (16+).
**11.00, 13.00** Багажныя войны. (12+).
**14.00, 20.00, 7.10** Голыя і напалоханыя (16+).
**18.00, 5.30** Хуткія і гучныя. (16+).
**19.00, 2.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**0.00** Мільёны Пабла Эскабара (16+).
**1.00** Самагоншчыкі. (16+).
**2.55** Космас. Пачатак. Будучыня (12+).

## Усходні гараскоп на



**АВЕН.** У панядзелак пастарайцеся настроіцца на працу. У сераду знойдзецца прымяненне вашаму інтэлектуальнаму патэнцыялу. У чацвер пажадана не спрачацца з начальствам і не ствараць канфліктную сітуацыю. Паспрабуйце рэальна ацэньваць свае магчымасці і не засмучацца па дробязях, у выпадку няўдачы проста выпраўце дапушчаныя памылкі, і дасягняце мэты. Давайце паменш абяцанняў, выканаць іх будзе цяжка. Субота — законны дзень адпачынку, але ў нядзелю многае трэба будзе паспець.



**ЦЯЛЕЦ.** Смеласць і рашучасць дазволяць рэалізаваць дзелавыя планы. Можа ўзнікнуць спрыяльная сітуацыя, якая дапаможа падняцца па службовай лесвіцы. Толькі не заразіцеся зорнай хваробай. Паспрабуйце не адмаўляць у дапамозе людзям, якія звернуцца да вас. У асабістай сферы час спрыяльны як для новага знаёмства, так і для развіцця ўжо наяўных адносін. Канец тыдня падыходзіць для не вельмі далёкіх падарожжаў з любой нагоды.



**БЛІЗНЯТЫ.** Вы здольныя на якасны рывок у прафесійнай сферы, паспяхова справіцеся з наведзеннем парадку дома. Добра было б заняцца здароўем, адпачыць або запланаваць падарожжа. Увогуле, можаце займацца ўсім, чым хочаце — усё будзе ўдала. У сераду, хутчэй за ўсё, давядзецца заняцца падрыхтоўкай справаздач, шмат працаваць з паперамі, мець зносіны з людзьмі. Пачынаючы з чацвярга паспрабуйце знізіць рабочую нагрузку да мінімуму.



**РАК.** Панядзелак і аўторак пройдуць у спакойнай абстаноўцы, што дазволіць завяршыць важныя справы і не стаміцца. Пачынаючы з серады, падзеі пачнуць набываць некаторую непрадказальнасць. Не выключана, што яны адкрыюць для вас бліскучыя перспектывы і ў справах, і ў асабістым жыцці. Падвышаная нагрузка падасца непасільнай, але хутка вы адчуеце, як адкрыецца другое дыханне. У суботу пазнаёміцеся з новымі цікавымі людзьмі.



**ЛЕЎ.** Панядзелак і сераду прысвяціце актыўнай працы, вынік будзе прама прапарцыянальны выдаткаваным намаганням. У аўторак можна нечакана лёгка дамагчыся сваіх мэт, галоўнае, каб яны былі пастаўлены. Стрыманасць, сур'ёзнасць і гатоўнасць пайсці на апраўданую рызыку могуць прыцягнуць да вас увагу начальства і выклікаць яго павагу. У выхадныя не варта навязваць сваю волю блізкім людзям. Не верце нічыім абяцанням, асабліва ў суботу, абставіны складуцца па-іншаму.



**ДЗЕВА.** На гэтым тыдні для дасягнення жаданых вынікаў неабходна выкарыстоўваць такія якасці, як мяккасць, гнуткасць і ўменне ісці на разумны кампраміс. У гэтым выпадку вы з лёгкасцю пераадолееце ўсе перашкоды і апынецеся пераможцам нават у самых складаных сітуацыях. Не адмаўляйцеся ад магчымасці дапамагчы сябрам, бо ў найбліжэйшай будучыні можаце памяняцца ролямі. У чацвер ёсць імавернасць сутыкнуцца з праблемамі ў калектыве, дзеці могуць паскардзіцца на аднакласнікаў. Перш чым выказвацца з гэтай нагоды, паспрабуйце разабрацца ў сітуацыі.

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** Першая палова тыдня можа аказацца вельмі і вельмі напружанай. У аўторак і сераду пажадана не прымаць важных рашэнняў, будзе цяжка зрабіць выбар. Паспрабуйце пазбягаць канфліктаў: яны могуць вельмі істотна адбіцца на вашым фінансавым становішчы. Другая палова тыдня будзе спрыяльная для творчых планаў і задум, але без своечасовай рэалізацыі яны ператворацца ў пшык. Субота спрыяльная для адпачынку на прыродзе, толькі апранайцеся цяплей.



**СКАРПІЁН.** Магчымыя значныя поспехі ў сферы самаадукацыі, вывучэння моў і ў прасоўванні па кар'ернай лесвіцы. Вы апыняцеся ў цэнтры цікавых падзей і ў кампаніі яркіх, разумных, таленавітых людзей. І гэта менавіта ваш круг! У ім вы будзеце ззяць. Да таго ж зоркі прадракаюць фінансавы поспех і гармонію ў асабістым жыцці. Можна чакаць хай і невялікія, але прыемныя грашовыя паступленні. У канцы тыдня сітуацыя з фінансамі стане яшчэ лепшай, могуць з'явіцца шматабяцальныя планы і перспектывы, але пакуль без нейкіх канкрэтных дзеянняў.



**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні вам неабходна захоўваць ясную галаву і цвярозасць думак. Падтрымка ўплывовых людзей у сераду дапаможа заняць новыя пазіцыі ў дзелавой сферы. У чацвер вялікая імавернасць кароткіх рабочых паездак, якія будуць даволі стомнымі. Планы, складзеныя ў пятніцу, могуць не апраўдаць выдаткаў часу і сіл. У суботу шчырая размова з блізкімі людзьмі дасць магчымасць вырашыць праблему, якая даўно трывожыла.



**КАЗЯРОГ.** Надыходзіць досыць спрыяльны ў творчым плане тыдзень, калі, вядома, не вельмі ленавацца. Усё, што б вы ні захацелі, будзе атрымлівацца досыць лёгка, што вас можа нават здзівіць. Магчыма, варта пачаць нешта зусім новае. Удзяліце дастаткова ўвагі дзецям, ім патрэбныя вашы парады і кантроль, інакш магчымыя праблемы з вучобай. Мабыць, вам давядзецца крыху памяняць сваю пазіцыю па ключавых пытаннях.



**ВАДАЛЕЙ.** Справы ідуць на лад. Але важна падрыхтавацца да раптоўнага поспеху і не пачаць мітусіцца з радасці. Панядзелак варта прысвяціць вырашэнню сямейных праблем, удзяліць увагу бацькам. У сярэдзіне тыдня паспрабуйце адмовіцца ад любых паездак і не пускаць у дом чужых людзей. Старайцеся пазбягаць перагрузак на працы, залішняя занятасць не толькі не пакіне часу, каб радавацца жыццю, але можа негатыўна адбіцца на здароўі. Нядзеля спрыяльная для тых, хто шукае мудрасці або абароны.



**РЫБЫ.** Выкарыстанне новых ідэй і тэхналогій у рабоце дазволяць дамагчыся важных вынікаў. У панядзелак будзьце ўважлівыя ў выбары крыніц інфармацыі, магчымы недакладнасці і скажэнні. Канфліктную сітуацыю ў чацвер пажадана своечасова абысці, давярайце сваёй інтуіцыі. Успомніце аб назапашаных хатніх справах і праблемах не ў апошні момант. Гэта цалкам прыдатныя дні, каб стварыць у сябе дома ўтульнасць і парадак, змяніць інтэр'ер.

## Чацвер, 7 снежня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.15** Зона Х (16+).
**9.10, 22.10 Серыял «След» (16+).**
**10.55, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Забудзь і ўспомні» (16+).**
**13.10** «Дзіцячы доктар».
**13.45** «Дзень у вялікім горадзе».
**14.45, 15.25 Серыял «Райскае месца» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**21.50** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**0.00** Сфера інтарэсаў.
**0.55** «Дзень спорту».
**1.10 Серыял «Афіцэрскія жонкі». Заключная серыя (16+).**

### Беларусь 2

**7.00** «Тэлераніца» (12+).
**9.00, 19.10** «Тэлебарометр».
**9.05, 17.10 Серыял «Жанчыны ў чорным». 1-я і 2-я серыі (16+).**
**11.05, 22.05** «Тата зможа?» (16+).
**12.00 Серыял «Каманда» (16+).**
**14.05, 19.15** «На нажах» (16+).
**15.15, 22.50 Серыял «Іх перабблыталі ў раддоме» (16+).**
**16.15, 23.50** «Нічога сабе ньюз» (12+).
**16.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**20.25** «Паненка-сялянка» (16+).
**21.30** «Багіня шопінгу» (16+).
**22.00** «Спортлато 6 з 49», «КЕНО».

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Запечаная бульба з грыбамі.
**8.05, 12.00, 20.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.15** «Гэты дзень».
**8.25, 18.30 «Пётр Лешчанка. Усё, што было...» Маст. фільм (16+).**
**9.25, 17.50** «Апошні дзень». Анатоль Кузняцоў (12+).
**10.05** «Святло далёкай зоркі». Памяці рэжысёра, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Віктара Карпілава.
**10.30** «Эпоха Максіма Багдановіча».
**11.00 «Тры талеры». Маст. фільм (6+).**
**12.20** «Старыя казкі».
**12.45** «Сінематэка». Беларускія фільмы 60-х гадоў.
**13.25** «Неразгаданыя людзі». Дак. фільм (12+).
**13.50 «Расследаванні камісара Мегрэ». Серыял (16+).**
**15.20, 21.05 «Дзяржаўная граніца». Маст. фільм «Усходні рубеж» (12+).**
**19.25** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**20.10** «Беларуская кухня». Вушкі з грыбамі.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.30** «Песні пад гітару».

### Беларусь 5

**7.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 6-ы тур. «Ліверпуль» (Англія) — «Спартак» (Расія).
**9.25** Хакей. КХЛ. «Нафтахімік» (Ніжнякамск) — «Дынама-Мінск».
**11.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 6-ы тур. «Шахцёр» (Украіна) — «Манчэстэр Сіці» (Англія).
**13.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 6-ы тур. Агляд гульнявога дня.
**14.20** Спорт-мікс.
**14.30** Баскетбол. Кубак ФІБА. «Цмокі-Мінск» (Беларусь) — «Альба» (Венгрыя).
**16.15** Слэм-данк.
**16.45** Легенды спорту: беларускія гісторыі. Л. Чаркашына.
**17.20** Свет англійскай прэм'ерлігі. Відэачасопіс.
**17.50** Авертайм.
**18.25** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. Другі этап. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**20.40** Спорт-цэнтр.
**20.50** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 6-ы тур. «Спарта» (Чэхія) — «Астана» (Казахстан). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**23.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 6-ы тур. «Арсенал» (Англія) — БАТЭ (Беларусь). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.10, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**9.10** «Тэорыя змовы» (16+).
**10.00** «Жыць здарова!» (12+).
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.20, 13.10, 19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**13.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**14.55** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.20** «Адваротны адлік». «Жанчына. Выпрабаванне вайной» (12+).
**16.55** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Другі зрок». (16+).**
**23.05** «Вячэрні Ургант» (16+).
**23.45** Начныя навіны.
**0.00** «Час пакажа» (16+).

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10. 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 1.35** «Тайны Чапман» (16+).
**9.35, 23.25** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**10.40, 0.15 «Дэпартамент» Серыял (16+).**
**12.30, 23.25** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**13.50 Камедыя «Каханне і іншыя непрыемнасці». (16+).**
**15.30** «Вадзіць па-руску» (16+).
**15.55** «Мінск і мінчане».
**16.50 «Салдаты і афіцэры». Серыял (16+).**
**17.35 «Разведчыцы». Серыял (16+).**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «У пастцы часу». (12+).**
**22.10** «Глядзець усім!» (16+).
**23.05** «Аўтапанарама» (12+).
**1.55** Eric Clapton: Фестываль гітарнай музыкі «Скрыжаванні». 2-я частка (16+).

### МІР

**7.30** «Добрай раніцы, свет!» (16+).
**8.35** «Няма праблем» (16+).
**10.00, 4.55** «Любімыя акцёры» (12+).
**10.30, 13.15, 19.20 Серыял «Маша ў законе» (16+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**14.25** «Іншы свет». Адносіны, якія забіраюць сілы (12+).
**15.00** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 18.05, 5.35 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**21.15 Серыял «Аддзел 44» (16+).**
**23.10 Маст. фільм «Папялушка з райскага вострава» (16+).**
**0.50 Маст. фільм «Пізанская вежа» (16+).**
**2.55 Серыял «Мафіёза» (16+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Пакой смеху». (16+).
**12.00, 22.30, 23.10 Серыял «Свая чужая». (16+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу. (12+).
**15.45** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.35** «Лёс чалавека». (12+).
**18.45** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір». (16+).
**20.35 Серыял «Марозава». (12+).**
**22.10** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым. (12+).
**0.15 Серыял «Правакатар». (16+).**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10, 7.10** «Дзелавая раніца НТБ». (12+).
**7.50, 8.05 Серыял «Вяртанне Мухтара». (16+).**
**9.40, 23.30** «НЗ.by».
**10.25 Серыял «Падазраюцца ўсе». (16+).**
**11.05 Серыял «Сведкі». (16+).**
**12.00** «Суд прысяжных». (16+).
**13.30, 18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.10 Серыял «ППС». (16+).**
**16.30** «Спецыяльны выпуск». (16+).
**17.30 Серыял «Мянтоўскія войны». (16+).**
**19.40 Серыял «Чужы твар». (16+).**
**21.30 Серыял «Шэлест».**
**23.50** «Вынікі дня».
**0.20 Серыял «Версія». (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.45, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Сябры дзядулі Марка» (0+).
**7.25, 16.00** Для дзяцей «Адказвайка».
**7.30** Раніца на восьмым.
**10.30** Дзецям пра зверанят.
**11.00** «АртЛайт».
**11.15 Трылер «Падзенне» (18+).**
**13.00 Серыял «Жорсткае каханне».**
**14.25 Серыял «Прыгоды маладога Індыяны Джонса».**
**16.05** «Мультпарад».
**16.30** «Мой любімы гадаванец» (0+).
**17.00** Дак. фільм «Таежная тайна».
**17.25 Серыял «Сталічны дом».**
**18.30 Серыял «Давяраю табе».**
**19.15** «Фэшн is my прафэшн».
**19.50 Серыял «Свой сярод чужых».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах» (0+).
**21.15 Трылер «Санктум» (16+).**
**23.00 Серыял «Каханне каля возера».**

### ВТБ

**6.00, 15.15** Серыял «Вароніны». (12+).
**7.20** «Дурні і дарогі». (16+).
**7.40, 4.20** М/ф «Дуда і Дада». (0+)
**8.00, 4.30** М/ф «Смяшарыкі». (0+)
**8.20, 4.50** М/ф «Аліса ведае, што рабіць!» (6+)
**8.50, 3.50** «Ералаш». (6+)
**9.30** Серыял «Сямейны бізнес». (12+).
**10.40** Камедыя «Бармэн». (16+).
**12.40** Скетч-шоу «6 кадраў». (16+).
**13.00, 19.00** Серыял «Псіхалагіні». (16+).
**14.10, 20.10** Серыял «Атэль «Элеон». (16+).
**16.45, 5.10** Серыял «Ранеткі». (12+).
**17.50, 22.55** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.20** Камедыя «Карпаратыў». (16+).
**0.00** Серыял «Васьмідзясятыя». (16+).
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**1.50** Серыял «Закрытая школа». (16+).
**3.30** «Лаві момант». (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** Пернікавы домік. «Каляровая гжэль».
**7.05** «Легенды сусветнага кіно». Ала Ларыёнава.
**7.35** «Пешшу...» Масква пасольская.
**8.05, 21.10** «Правілы жыцця».
**8.35, 22.15** «Абацтва Даўнтан». Маст. фільм.
**9.25** «Сакрэты старых майстроў». Фядоскіна.
**9.40** Галоўная роля.
**10.15, 17.45** «Назіральнік».
**11.10, 0.35** ХХ стагоддзе. «Сустрэча ў Канцэртнай студыі «Астанкіна». Яўген Еўтушэнка». 1979 год.
**12.25** «Гульня ў бісер». «Юльян Сямёнаў. «Сямнаццаць імгненняў вясны».
**13.10, 20.05** «Бляск і слава Старажытнага Рыма». Дак. фільм.
**14.05** «Аляксандр Кайданоўскі. Недатыкальны». Дак. фільм.
**15.10, 1.50** Гістарычныя канцэрты. Фестываль «Снежаньскія вечары».
**16.05** Пернікавы домік. «Мастацтва хаамей».
**16.30** «Лінія жыцця». Юрый Вяземскі.
**17.30** Важныя рэчы. «Духоўны рэгламент».
**18.45** «Я мясцовы. Тэадор Курэнтзіс (Перм)». Дак. фільм.
**19.45** Галоўная роля.
**20.55** «Добрай ночы, малыя!»
**21.40** «Энігма. Марта Домінга».
**23.10** Урокі рускай. Чытанні. І. Бабель. «Як гэта рабілася ў Адэсе». Чытае Павел Лунгін.
**23.55** «Ігнат Сцялецкі. Тайна падземных палат». Дак. фільм.
**2.45** «Pro memoria». «Усход і ўсход».

### Настальгія

**6.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Піянеры шоу-бізнеса». 2005 год (16+).
**7.05, 8.40, 9.40, 11.00, 14.10, 15.40, 17.00, 18.50, 20.25, 21.40, 23.00, 1.55, 2.40, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.30** Маст. фільм «Жыў-быў наладчык». (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
**13.05** Маст. фільм «Дробязі жыцця». (16+).
**14.30** «Час пік» з У. Лісцьевым. 1995 год (16+).
**18.00** «Эліта Краіны Саветаў». Яўген Сцяблоў. 2007 год (12+).
**19.00** «Вакол смеху». 1979 год (12+).
**20.35** «Час пік» з Сяргеем Шатуновым. 1995 год (16+).
**0.00** Тэлефільм «Дзень на дваіх». (16+).
**2.30** «Час пік» з Андрэем Разбашам. 1995 год (12+).
**5.15** Тэлефільм «А. П. Чэхаў. Сцэнкі». (16+).

### EuroSport 1

**3.30, 10.35, 14.00, 20.30** Біятлон. Кубак свету.
**4.30** Лыжнае дваяборства. Кубак свету.
**5.00, 9.00, 15.00, 21.00** Снукер. UK Championship.
**6.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету.
**7.30, 2.40** Watts.
**8.30, 20.00** Футбол. «ФІФА».
**10.30** Зімовыя віды спорту. «У пагоні за гісторыяй». Ліндсі Вон.
**11.30, 1.35** Дрон-рэйсінг. DR1 Champions.
**12.30** Аўтагонкі. «Формула Е».
**13.30** Зімовыя віды спорту. Sports destination.
**14.30, 19.30** Скачкі з трампліна. «Нерасказаная гісторыя». Каміль Стох.
**20.25, 2.35** «Гісторыі спартсменаў».

### Кінакамедыя

**1.30** Камедыя « Выратаваць Пушкіна». (6+).
**3.05** Камедыя «Самы лепшы дзень». (16+).
**5.00** Камедыя «Уцекачы». (12+).
**6.45** Камедыя «Запалі гэтым летам». (16+).
**8.35** Камедыя «Душэўная кухня». (16+).
**10.30** Камедыя «Сняданак у таты». (12+).
**12.15** Камедыя «Палавое выхаванне». (18+).
**14.00** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**14.20** Меладрама «Сняданак у ложак». (16+).
**16.10** Камедыя «Часова цяжарная». (16+).
**17.50** Камедыя «Забі мяне тройчы». (18+).
**19.30** Камедыя «Сямейнае аграбленне». (16+).
**21.15** Прыгоды «Адзін шанц на дваіх». (16+).
**23.20** Камедыя «Маёмасць з хвастом». (12+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.55** «Доктар І...» (16+).
**8.25** «Трэндзі» (16+).
**8.55, 19.00, 2.30** «Кузей. Гюней». Серыял (16+).
**10.30, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.05, 18.00** «Сляпая» (12+).
**13.05, 16.55** «Варажбітка» (12+).
**14.10** «Паралельны свет» (12+).
**15.05** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**15.35** «Здзелка» (16+).
**16.05** «Натуральны адбор» (12+).
**20.45** «Развітанне» (16+).
**21.35** «Рэвізора» (16+).
**22.40, 5.35** «Алігарх-ТБ» (16+).
**23.10** «Візіцёры». Серыял (16+).
**23.55** «1 + 1». Трагікамедыя (16+).
**1.40** «Звезданутыя» (16+).

### ТБ1000

**6.10, 17.45** Назад у будучыню III (6+).
**8.40** Настаўнік на замену (16+).
**10.45** Помста ад куцюр (16+).
**13.10** Прыгоды Цінціна: тайна «Аднарога» (12+).
**15.30** Пабочны эфект (16+).
**20.10** Апошні самурай (16+).
**23.05** Зваротная цяга (16+).
**1.40** Выкупленне (18+).
**3.40** Адвакат д'ябла (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Брат-2 (16+).
**8.45** Танцы насмерць (12+).
**10.45** Чалавек ля акна (12+).
**12.45** Зорка чароўнага шчасця. 2-я серыя (16+).
**14.20** Крыжаносец (16+).
**16.20, 4.20** Тэрмін даўнасці. 1—2-я серыі (16+).
**18.20** Канец цудоўнай эпохі (16+).
**20.20** Падарунак з характарам (0+).
**22.20** Крыніца (12+).
**0.20** Экспірыенс (16+).
**2.20** Космас як прадчуванне (16+).

### National Geographic

**6.00** Узлом сістэмы. (16+).
**6.25** Зрабі або памры. (12+).
**6.50** Займальная навука. (12+).
**7.40, 5.35, 5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**7.55** Сапраўдны суперкар. (12+).
**8.40, 11.10** Шаша праз пекла. (12+).
**9.30** Дзікі тунец. (12+).
**10.15** Мегазаводы. (12+).
**11.55, 17.10, 20.20** Аўта-SOS. (12+).
**12.40** Навука будучага Стывена Хокінга. (12+).
**13.25** Гульні розуму. (12+).
**14.50** Гады небяспечнага жыцця. (12+).
**15.40** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха. (12+).
**16.25, 19.35, 0.05, 2.20** Расследаванні авіякатастроф. (12+).
**18.00, 21.05, 0.50, 3.55** Служба бяспекі аэрапорта (16+).
**18.45, 22.40** Пачатак. (12+).
**21.50, 1.35, 4.50** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала. (16+).
**23.20** Паранармальнае. (16+).

### Discovery

**8.00, 17.00, 22.00, 4.40** Махінатары. (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 6.20** Як гэта ўстроена? (12+).
**10.00, 16.00, 23.00, 3.50** Паляўнічыя на складзе. (16+).
**11.00, 13.00** Горад навыварат. (12+).
**14.00, 7.10** Голыя і напалоханыя (16+).
**18.00, 5.30** Хуткія і гучныя. (16+).
**19.00, 0.00, 2.00** Залатая ліхаманка. (16+).
**20.00** Мяцеж. (12+).
**1.00** Самагоншчыкі. (16+).
**2.55** Аляска. Апошні рубеж (12+).




## САЛОДКІЯ АБДЫМКІ

...Свой 55-ы дзень нараджэння і звязаны з ім выхад на пенсію Галіна Пятроўна адзначала ў рэстаране і сабрала амаль увесь калектыў.

Была сярод запрошаных і Ліза. Разам з імяніннiцай яна шмат гадоў працавала на адным участку, а таму, як чалавек творчы, падрыхтавала для Галіны Пятроўны адмысловае вершаванае віншаванне: цэлую оду, можна сказаць.

З ёй і з'явілася на свята.

Сталы ў зале былі расстаўлены літарай «П». За сярэднім, у самым цэнтры, сядзела віноўніца ўрачыстасці. Побач з ёю — тамада, па камандзе якога госці ўставалі з месцаў, рознымі словамі хвалілі юбілярку, віншавалі з прыгожай датай ды жадалі моцнага здароўя...

Дайшоў тост і да Лізы. Яна зараней падумала, што проста зачытаць сваю оду з прыгожай паштоўкі будзе відавочна замала: потым яе трэба яшчэ і ўручыць...

Для таго, каб гэта зрабіць, дзяўчына, атрымаўшы слова, устала з-за стала, падышла бліжэй да імянінніцы...

Тут трэба сказаць, што ў цэнтры ўвагі была не толькі Галіна Пятроўна, але і велізарны торт, які стаяў насупраць, з іншага краю стала.

Ліза ж з ім стала побач і з такім натхненнем чытала свой верш, што проста да слёз расчуліла юбілярку. Галіна Пятроўна працягнула рукі да Лізы, каб абняць... Дзяўчына, вядома ж, таксама памкнулася наперад і нават не заўважыла, што спачатку прытулілася жыватом да... торта і толькі потым ужо — шчакой да твару імянінніцы.

...На сваё месца за сталом Ліза ішла задраўшы нос. Ну яшчэ б: не марна старалася! Гэта, яе выступленне, было найлепшае за сённяшні вечар! Усе, бач, знямелі — так уважліва слухалі. Вось што значыць паэзія!..

Пляму на сукенцы ёй паказалі ўжо на месцы. Седзячы за сталом, Ліза акуратненька нажыкам саскрэбла пушысты крэм, потым, зачыніўшыся ў прыбіральні, на тлустую пляму густа насыпала солі.

Сукенка была сіняга, цёмнага колеру, таму следу на ёй амаль не засталося. Да таго ж святла на танцпляцоўцы было мала. А значыць, юбілей у рэстаране хоць і быў трохі азмрочаны, але не сапсаваны.

**Таццяна Чэкед,**
*г. Гомель.*

## ПЕРАСТАРАЎСЯ...

Гадоў пад 50 таму нашаму раёну даверылі вылучыць кандыдатам у дэпутаты абласнога савета старшыню калгаса. Перадавым тады быў наш. Так што ўсяго і заставалася, што выканаць працэдуры, а найперш — правесці агульны сход калгаснікаў.

...Тыдні за два да гэтай падзеі з арміі вярнуўся мой аднакласнік Сяргей. Вучыўся ён добра, але разам з дачкой Сцяпанавіча (таго самага старшыні калгаса) на юрфак не паступіў. Адвучыўся ў ПТВ, атрымаў прафесію муляра і, магчыма, яшчэ раней сцяміў, што з партбілетам выбіцца ў людзі будзе прасцей. Вось ён і стараўся: праз паўгода службы стаў камсоргам батальёна, праз паўтара — атрымаў такі жаданую чырвоную кніжачку.

Але і гэта не ўсё: са службы Сяргей прывёз проста шыкоўны (ва ўсякім разе першы ў нашых мясцінах) сіні крымпленавы касцюм, белую нейлонавую кашулю з гіпюрам і бліскучыя чорныя чаравікі. У гэтым «прыкідзе» ён мог бы ўпрыгожыць вітрыну ў раённым універмагу, але ж спачатку з'явіўся на танцы ў клуб, ды праз пару дзён завітаў да калгаснага парторга, каб стаць на ўлік, а заадно закінуць вудачку наконт пасады прараба (былы — дзядзька Федзя — загнаў некаму тры паддоны цэглы, папаўся і на той час чакаў прысуду). Парторг і адказаў яму, што ўсе пытанні з кадрамі вырашае сам Сцяпанавіч, старшыня, якога ў панядзелак на сходзе будуць вылучаць кандыдатам...

— Можна я таксама ў падтрымку выступлю? — спытаў Сяргей, скеміўшы, што ён такім чынам можа злавіць двух зайцаў: па-першае, спадабацца старшыні, па-другое, «засвяціцца» перад раённым начальствам (бо нехта ж павінен прыехаць?).

Хвалебную прамову на адрас старшыні ён прадумаў загадзя, запісаў на паперы і завучыў на памяць, як некалі верш. У нядзелю вечарам (сход у панядзелак) яму заставалася асвяжыць трохі «стрэлкі» на сваіх крымпленавых портках. Для гэтага ён разлажыў іх на стале, уключыў прас, выскачыў на кухню, каб намачыць марлю...

Карацей, калі вярнуўся, у пакоі ўжо вісеў дым, а на портках «красавалася» вялікая рудая пляма...

З паўгадзіны ў хаце панавала роспач: маці Сяргея бедавала ці не болей чым сын... І яна ж прыдумала выйсце: назаўтра, прыхапіўшы 120 маміных рублёў, хлопец адправіўся ў райцэнтр і ўжо ў другім магазіне знайшоў сабе новы касцюм. Адзін недахоп быў — паясніца ў портках шырокая. Але з-за гэтай драбязы Сяргей нават не перажываў: на службе ён досыць добра ўпраўляўся з іголкай, таму штаны завузіць мог сам.

...Непрыемнасці пачаліся з іншага — з таго, што аўтобус адправіўся ў рэйс амаль на гадзіну пазней, і брацца за іголку ўжо не выпадала — часу не было. Таму лішніцу ў паясніцы Сяргей «надзейна» прыхапіў на вялікую шпільку (з яе дапамогай маці чапляла занавескі да печы), прыбраўся ў новы касцюм і пабег на сход.

Першымі там выступалі сакратар райкама, адна з даярак і дырэктар школы. Нават ён па паперцы... А таму Сяргей, які збіраўся гаварыць як бы ад душы, экспромтам, ужо прадчуваў трыумф.

Пачатак яго выступлення і сапраўды ўражваў. Але ж запомніўся больш канец, бо Сяргею здалося, мала сказаць, што ён у дзве рукі будзе галасаваць за шаноўнага Мікалая Сцяпанавіча, — трэба яшчэ і паказаць...

Для гэтага ён ускінуў рукі ўверх... Мусіць, зарэзка, бо мамчына шпілька неспадзеўкі пстрыкнула, новенькія порткі паехалі ўніз на бліскучыя чаравікі, а сход проста пакаціўся ад рогату.

...Што там было яшчэ, Сяргей не чуў: аберуч трымаючы свае штаны, ён выскачыў з клуба.

Чаканы трыумф абярнуўся адчаем: перастараўся.

**Віталь Г.,**
*г. Барысаў.*

## ПАШЛІ ЦІТА ПА СІТА...

Гэта здарылася тады, калі шмат чаго было не дакупіцца. Тая ж гарэлка ў крамах — па талонах... А вось самагонкай таргавалі многія.

Дык вось. Адным цёплым суботнім днём нашы мужыкі сышліся ў гаражах (яны метраў за 50 ад жылых дамоў) і трохі выпілі. Як заўжды, ім здалося, што мала: скінуліся яшчэ раз і паслалі ганца (не зусім цвярозага...) да Ягораўны па чарговую пляшку. Самі ж селі чакаць, а заадно — весці назіранне. Усё як на далоні: вось той «пасланец» ідзе ў бок дома, вось ён заходзіць у патрэбны пад'езд, вось гаспадыня (гэта ж няцяжка ўявіць?) адчыняе яму дзверы, бярэ грошы, аддае гарэлку...

Смак яе ўжо цешыць падагрэтыя страўнікі. Але што гэта? Праходзіць 10 хвілін — ганца не відаць, праходзіць 20 і 30... «Пашлі дурнога, за ім другога», — злуюць мужыкі, але ж іншага выйсця не маюць.

І вось ужо ён, той, другі, спяшаецца ў бок дамоў, праходзіць з паўдарогі і... спыняецца. Ад гаражоў добра відаць, як ён то памкнецца наперад, то здасць назад, але не ідзе нікуды.

«З чаго б гэта?» — думаюць мужыкі.

А ўсё было проста (як потым дазналіся): назад, да гаражоў, яму нельга было, бо сябры сказалі, каб без гарэлкі не вяртаўся. І ўперад нельга, бо там, на лаўцы каля пад'езда, сядзела яго жонка, а побач з ёю — Ягораўна.

...Праўду кажучы: няма нічога таемнага, што не стала б яўным. Бліжэй да вечара мужчыны дазналіся, што першаму з ганцоў гандлярка прапанавала прысесці на канапу — трошкі пачакаць, пакуль бутэльку нальле.

А гарэлка, відаць, была добра прыхаваная...

Карацей, пакуль гаспадыня даставала яе ды пакуль налівала, пакупнік... заснуў. Ягораўна хацела пабудзіць, — пачапала яго за плячук, за вуха — марна: спіць чалавек як пшаніцу прадаўшы. «Ну не вадой жа яго паліваць?» — падумала жанчына. А потым пад галаву яму падсунула падушачку, нейкай дзяружкай накрыла ногі, і сама на вуліцу, на лаўку — пагутарыць з жанкамі.

Прачнуўся той ганец толькі вечарам і страху хапіў напоўніцу: ну як жа — чужая канапа, чужая хата, падушка...

Шчасце яшчэ, што паўлітроўка побач свая.

Вось яна і вярнула чалавека да памяці.

...Як ён апраўдваўся перад мужыкамі, шчыра кажучы, не ведаю. Ведаю, што пра ўсіх марудаў у нас дагэтуль гавораць: «Ну цябе пасылаць, як Стурэйку па гарэлку».

**Кацярына Будзіловіч,**
*г. Скідзель.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

***АД ЯЕ Ж. «Кожны год да нас прыходзіць новым, адыходзіць змрочным і старым».***

***Што праўда, тое праўда: не варта спрачацца з класікам. А вось пашукаць сабе трошкі сонца — можна.***

***Што для гэтага трэба? Ды, можна сказаць, драбяза: з хатняй шуфляды, газетнай падшыўкі ў бібліятэцы альбо архіва на сайце «Звязды» выцягнуць на вочы ўсе «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі», што друкаваліся на працягу года, яшчэ раз перачытаць іх (і, хочацца верыць, атрымаць задавальненне), кожную ацаніць па пяцібальнай сістэме і такім чынам вызначыць сваю, уласную дзясятку найлепшых. Потым гэтую інфармацыю добра было б адправіць у рэдакцыю, дзе ўжо «намалявана» адмысловая табліца. У першых яе калонках — назвы «баек», даты публікацый і прозвішчы аўтараў... У апошніх — на фінішы года — з'явіцца колькасць балаў — як ад сябраў вялікага чытацкага журы, так і маленькага рэдакцыйнага...***

***Якраз яно і назаве пераможцаў конкурсу — аўтараў найлепшых вясёлых і праўдзівых гісторый, змешчаных у 2017-м... Каб, магчыма, у новым 2018-м усё пачаць спачатку, бо крыніцы беларускага народнага гумару, здаецца, невычэрпныя.***

***Пішыце!***

■ Неасабісты суб'ектыў

# СВАЯ НОША



## Наступствы ўрбанізацыі, пра якія мы не думалі

БАБЦЯ Рая, якую паклалі ў адну з палат у панядзелак, ужо да серады далася ў знакі ўсяму аддзяленню. Дзевяностагадовая бабуля трапіла ў бальніцу з моцнай прастудай, але аказалася дужая ў нагах і руках і надзвычай ўпартая. Ноччу яна выходзіла з палаты і ішла гуляць па калідоры, перабудзіўшы пры гэтым (прычым свядома, трасучы за ногі і патрабуючы «Уставай!») усіх сваіх суседак. Днём таксама, калі не згледзіш, бабка зноў была на калідоры і цікавала ва ўсе палаты, пужаючы пацыентаў, асабліва мужчын. Санітаркі цярпліва прыводзілі бабку на месца, садзілі на ложак, супакойвалі. Снатворнае яна браць адмаўлялася катэгарычна: маўляў, вы мяне хочаце атруціць. Увогуле даверу да незнаёмых людзей у яе не было ні каліва, таму ўсе свае рэчы: і прадукты, і адзенне, і абутак — склала ў адзін хатулёк і трымала на ложку каля падушкі, кожныя паўгадзіны абмацваючы, правяраючы, ці ўсё на месцы...

«Што за дзеці — збылі з рук бедную старую!» — кінуў у роспачы хтосьці з наведвальнікаў. Але яно насамрэч зусім не так. Да бабулі кожны дзень прыходзіла дачка — сама ўжо немаладая кабета. Прасіла прабачэння ў суседак па палаце за турботы. Ласкава ўпрошвала: "Паеш, мамачка», папраўляла скамечаную за бяссонную ноч пасцель, гладзіла маці па нязграбных напрацаваных руках. Бабуля супакойвалася, але не надоўга, раптам узвівалася, пачынала трывожна пытаць: «А грошы дзе? Ты прывезла мае грошы?!» — «Тут, мамачка, твае грошы», — ледзь не плачучы адказвала дачка, дастаючы з кішэні ў старой загорнутыя ў насоўку купюры. «Нікому не верыць, — скрушна тлумачыла выпадковым назіральнікам, — столькі год жыла адна ў амаль пустой вёсцы. Толькі сёлета ледзь угаварылі да нас перабрацца. Думала ехаць даглядаць яе сама ў родную хату, але дзе ж ты тут усё кінеш — муж, унукі... Яна і ў нас па кватэры па начах блудзіць, не можа зразумець, дзе яна, дадому просіцца...»

СЁННЯ бабку Раю павінны выпісаць: прастуду ёй вылечылі. Дачка забярэ яе да сябе, і ўжо ў гарадской цёплай кватэры бабка будзе блукаць па начах, шукаць свае грошы, якія ляжаць у кішэні, прасіцца дадому, капрызіць без прычыны — старыя ж, яны часам як малыя дзеці. Дачка будзе разрывацца паміж сваёй любоўю да маці, абавязкам перад ёй і імкненнем зрабіць так, каб усё было як раней, каб муж быў спакойны і задаволены, каб самой адпачываць уначы пасля штодзённых клопатаў. Чым усё скончыцца — не ўгадаеш. Можа, бабка так і застанецца дажываць свой век з дзецьмі пад клапатлівай апекай дачкі і раздражнёным позіркам зяця. Можа, цярпення ў іх не хопіць і яны адправяць маці ў які інтэрнат або на сацыяльны ложак у бальніцы і будуць шукаць і не знаходзіць сабе апраўдання кожны дзень, кожную хвіліну. Можа, бабка сваёй упартасцю пераможа ўсіх і прымусіць завезці яе назад у родную хату. І там да яе будзе хадзіць сацыяльны работнік, і дачка паспрабуе супакоіць гэтым сваё сумленне, а яно не будзе супакойвацца... З упэўненасцю можна сказаць толькі адно: шчаслівых людзей (самых родных, якія любяць адно аднаго) у гэтай гісторыі — пры любым варыянце яе развіцця — ужо не будзе.

ГЭТА бяда і крыж менавіта гэтага пакалення беларусаў — тых, каму сёння пяцьдзясят—шэсцьдзясят. Непрыкаяныя састарэлыя бацькі. Першым заўсёды цяжка, а яны першыя вось так балюча адчуваюць на ўласным горкім досведзе наступствы масавага сыходу маладых вяскоўцаў у горад, які ў далёкіх ужо 70-х—80-х вельмі нават заахвочваўся. З вясковай хаты пасля школы з'язджалі ўсе дзеці, заставаліся толькі бацькі ды дзед або бабка. Менавіта тады зламалася нешта важнае ў нашай традыцыйнай сістэме грамадскага ладу. Парушылася повязь, пераемнасць пакаленняў, бо дагэтуль не было ніколі ў беларусаў так, каб з бацькамі (ці зусім побач з імі) не заставаўся жыць ніхто з дзяцей. І павучальная казка пра зэдлік — гэта менавіта наша, народная казка, на якой усе мы гадаваліся. (Памятаеце, яна пра малога хлопчыка, які, убачыўшы, як бацька пасадзіў свайго старога бацьку не за сямейны стол, а на зэдліку за печ, пачаў габляваць дошчачку. А калі бацька спытаўся, навошта, адказаў: «Буду, татка, рабіць табе зэдлік, ты ж хутка стары станеш, я цябе за печ пасаджу». Канешне, дзеда тут жа вывелі з-за печы і пасадзілі на пачэснае месца за сталом.)

У нас жа і дамы для састарэлых, і тыя самыя сацыяльныя ложкі, і дамы часовага знаходжання, дзе збіраюць на зіму адзінокіх немаладых людзей, з'явіліся зусім нядаўна, бо раней у іх проста не было патрэбы. Цяпер усё інакш, але казка пра зэдлік яшчэ сядзіць у нашых галовах, у свядомасці. І ў тым, што родны чалавек (які, як нярэдка бывае, наадрэз адмовіўся пераязджаць у горад да дзяцей «цэглу нюхаць») хоць і не побач, але ў доглядзе, няма ніякага суцяшэння. Калі ж бацька ці маці на пераезд усё ж пагаджаецца, усім даводзіцца прывыкаць і прыстасоўвацца, дзесьці ламаючы звычайны шматгадовы лад, амаль як чужым людзям, бо доўгія гады жылі не адной сям'ёй, а на адлегласці і бачыліся толькі на выхадныя. І нічога тут не папішаш, і ўніверсальнага выйсця, каб усім дарагім адно аднаму людзям было добра і спакойна, мы пакуль не знайшлі. Можа, таму з наступленнем халадоў у нашых вялікіх гарадах так шмат дарослых людзей з заклапочанымі і крыху вінаватымі тварамі?..

НЯДАЎНА ў адной амерыканскай пісьменніцы прачытала адну прытчу. Арол з апошніх сіл пераносіў на спіне праз глыбокую цясніну свайго сына, які яшчэ не ўмеў лётаць. Калі небяспечнае падарожжа скончылася, арол спытаў у малога: «Ну, што, а калі я стану знямоглым, а ты будзеш дужай дарослай птушкай, ты панясеш мяне на сваіх плячах?» — «Не, бацька, — адказала птушаня. — Тады на плячах я буду несці свайго сына...»

Іншыя часы — іншыя казкі?..

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

| Порядок ознакомления | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 13.00 до 14.00. Ответственное лицо: Мысник Наталья Васильевна, заместитель управляющего, контактный телефон МТС: +375 29 516-32-23 |
|---|---|

**Транспорт, спецтехника и оборудование, расположенные по адресу:** Витебская область, Полоцкий район, Экиманский с/с, 0,3 км к востоку от д. Ксты, в составе

| Лот № | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 17 | 01153 | Автомобиль ГАЗ 31105 2224ВА-2 | 1 037,60 | 51,88 |
| 18 | 03454 | Дизмолот сваебойный МСДШ | 3 792,00 | 189,60 |
| 19 | 02500 | Захват 1ПТМ 791170г/п 10т | 288,00 | 14,40 |
| 20 | 02501 | Захват 2ПТМ 791170г/п 5т | 360,00 | 18,00 |
| 21 | 02218 | Кран башенный БМ-401П | 47 976,00 | 2 398,80 |

**Порядок ознакомления:** ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Абловацкий Петр Владимирович, ведущий механик, контактный телефон +375 29 212-15-01

**Оборудование, расположенное по адресу:** Витебская область, Полоцкий район, Экиманский с/с, 0,3 км к востоку от д. Ксты, в составе

| Лот № | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год изготовления | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 22 | 31800 | Агрегат сварочный АДД 4002 М2, 2006 г. в. | 1 056,00 | 52,80 |
| 23 | 31801 | Агрегат сварочный АДД 4003, 2000 г. в. | 912,00 | 45,60 |
| 24 | 05063 | Дистилятор | 60,00 | 3,00 |
| 25 | 00086 | Измеритель дымности отработавших газов МЕТА-01 МП.01, 2009 г. | 118,60 | 5,93 |
| 26 | 31798 | Сварочный аппарат JASIC ARC-140, 2007 г. в. | 9,60 | 0,48 |
| 27 | 05106 | Станок сверлильный СМ-8П,1993 г. | 128,20 | 6,41 |
| 28 | 05081 | Станок СУН-1 (механическая пила), 1992 г. | 335,00 | 16,75 |
| 29 | 05071 | Станок шлифовальный 3К-634, 1987 г. в. | 60,00 | 3,00 |
| 30 | 05061 | Стенд Р-770, 1991 г. в. | 309,60 | 15,48 |
| 31 | 05053 | Тележка Э-312, 1991 г. в. | 38,40 | 1,92 |
| 32 | 31816 | Трансформатор ТДМ-403 У2 | 64,80 | 3,24 |
| 33 | 41227 | Автоматический станок для резки штапика CKY-501 | 582,60 | 29,13 |
| 34 | 42020 | Выпрямитель V-160 S, 2006 г. в. | 68,00 | 3,40 |
| 35 | 42021 | Выпрямитель дуговой сварки ВДМ-1202С, 2007 г. | 273,00 | 13,65 |
| 36 | 47228 | Комплект тензометрии BSS-2t с индикатором Ci 6001 | 38,40 | 1,92 |
| 37 | 41080 | Линия по производству блоков из ячеистого бетона | 9 156, 00 | 457,80 |
| 38 | 47197 | Машина испытательная ИП-100, 1994 г. в. | 1 011,60 | 50,58 |
| 43 | 40221 | Парогазогенератор ПГГ-2 | 864,00 | 43,20 |
| 44 | 40015 | Сварочный аппарат ВДМ-1201, 1991 г. | 184,80 | 9,24 |
| 45 | 41228 | Станок для зачистки углов профиля КТ-504/2, 2009 г. | 1 212,00 | 60,60 |
| 46 | 41044 | Станок настольно-сверлильный ВШ-029 | 696,00 | 34,80 |
| 48 | 41048 | Станок правильно-отрезной СМЖ 357К | 792,00 | 39,60 |
| 49 | 42069 | Станок точечной сварки МТ16/18, 1991 г. | 676,80 | 33,84 |
| 50 | 44095 | Станок шлифовальный 3К-1334 | 184,80 | 9,24 |
| 51 | 00464 | Трансформатор сварочный ТДМ-252 У2 | 74,40 | 3,72 |
| 52 | 41065 | Установка горизонтальная СМЖ-54А | 1 608,00 | 80,40 |
| 53 | 40024 | Установка прогрева бетона КТП ТО 80-86 У1, 1996 г. в. | 275,40 | 13,77 |
| 54 | 41245 | Установка компрессорная СБ4/Ф (компрессор Remeza СБ4/Ф-500LT100), 2010 г. в. | 624,00 | 31,20 |
| 55 | 70223 | Шкаф металлический, 2000 г. в. | 53,60 | 2,68 |
| 56 | 8911 | Блок-контейнер | 729,20 | 36,46 |
| 57 | 8907 | Блок-контейнер «Душевые кабины женские» | 1 434,40 | 71,72 |
| 58 | 30004 | Нивелир НИ-3, зав. №2359 | 84,00 | 4,20 |
| 59 | 70230 | Перфоратор Bosch GBH 7-46 | 168,00 | 8,40 |
| 60 | б/н | Перфоратор Bosch GBH 7-46 | 168,00 | 8,40 |
| 61 | 00506 | Теодолит 3Т5КП | 302,40 | 15,12 |
| 62 | 04130 | Штукатурная станция СШ-6 | 1 128,00 | 56,40 |
| 64 | 04131 | Штукатурная станция СШ-6 | 984,00 | 49,20 |
| 65 | 00931 | Установка алмазного бурения DD-120 | 504,00 | 25,20 |
| 66 | 00485 | Блок снижения напряжения БСН 1 СУЗ, 2008 г. в. | 57,60 | 2,88 |
| 67 | 00486 | Блок снижения напряжения БСН 1 СУЗ, 2008 г. в. | 57,60 | 2,88 |
| 68 | 01207 | Очиститель высокого давления Kranzle 800 TS T | 432,00 | 21,60 |
| 69 | 01138 | Станция прогрева бетона ТСД 3-80/0,38 УЗ | 613,80 | 30,69 |
| 70 | 01139 | Станция прогрева бетона ТСД 3-80/0,38 УЗ | 613,80 | 30,69 |
| 71 | 00490 | Трансформатор НТС 2.5У, 2011 г. в. | 31,20 | 1,56 |
| 72 | 00491 | Трансформатор НТС 2.5У, 2011 г. в. | 31,20 | 1,56 |
| 73 | 00463 | Трансформатор ТДМ-403У2, 2008 г. в. | 64,80 | 3,24 |
| 74 | 01129 | Установка для приготовления и выдачи раствора УПР-3 | 2 224,80 | 111,24 |
| 75 | 01130 | Установка для приготовления и выдачи раствора УПР-3 | 2 224,80 | 111,24 |

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY**

**Порядок ознакомления:** ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 13.00 до 14.00. **По лотам №№17–32** ответственное лицо: Абловацкий Петр Владимирович, ведущий механик, контактный телефон: +375 29 212-15-01. **По лотам №№33–65** ответственное лицо: Зызников Виктор Иванович, заведующий базой, контактный телефон +375 33 677-45-09. **По лотам №№66–75** ответственное лицо Свердлов Михаил Данилович, ведущий энергетик, контактный телефон +375 29 516-31-13

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с **BY60BLBB30120191021390001001** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты: по лотам №№1–16**: не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи (если иное не предусмотрено договором купли-продажи).

**По лотам №№17–75**: при цене продажи предмета аукциона в сумме до 49 999,99 BYN – срок оплаты не более **10** (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи. При цене продажи предмета аукциона в сумме свыше 50 000,00 BYN – срок оплаты не более **20** (двадцати) дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. №16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне представляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5%

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона по лотам №№1–15, 17–75 опубликовано в газете «Звязда» от 11.11.2017 г., по лоту №16 в газете «Звязда» 16.11.2017 г.

Дата и время проведения аукциона: 19.12.2017 в 13.00 по адресу: РУП «СМТ №22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54, актовый зал

**Дата и время окончания приема документов: 15.12.2017 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**

Контактные телефоны: +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42.
Email: auction@cpo.by

## РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 12 декабря 2017 г. в 10.00 повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 50% после третьих несостоявшихся торгов по продаже автотранспортного средства, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Коминтерн» на праве собственности

| № лота | Наименование, краткая характеристика объекта | Начальная цена, рублей (в т. ч. НДС по ставке 20%) | Задаток, рублей (в т. ч. НДС по ставке 20%) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль ГАЗ 2705 435,** рег. знак АВ 7602-3, год выпуска 2004, цвет красно-бордовый. Номер кузова (рамы): 27050040124710 XTH27050040373500. Тип: грузопассажирский фургон. Вид топлива – бензин. Объем двигателя – 2460 см. куб. Местонахождение автомобиля: г. Гомель, ул. Интернациональная, 5 | **960,00** | **96,00** |

Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2–6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 11 декабря 2017 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 9.00 до 10.00 **12 декабря 2017 г**.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить предмет торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; индивидуальный предприниматель – паспорт, копию свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором аукциона; представитель индивидуального предпринимателя – паспорт и доверенность; представитель юридического лица (резидент РБ) – паспорт (руководитель – копию приказа, протокола о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидент РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY84ALFA30122305700080270000) в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, BIC: ALFABY2X. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 1 декабря 2017 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (единственным участником, выразившим согласие купить Объект), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (единственным участником, выразившим согласие купить Объект), Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (единственный участник, выразивший согласие купить объект) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере четырех процентов от цены продажи Объекта, сформированной в установленном порядке; в течение 10 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (единственным участником, выразившим согласие купить Объект) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за Объект, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты проведения аукциона.

*Извещение о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту было опубликовано в газете «Звязда» от 01.03.2017 г. №41, от 22.06.2017 г. №117, от 28.09.2017 г. №187*

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. • 8 (0232) 32-46-47; 32-00-71 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by. Продавец: ОАО «Коминтерн», г. Гомель, ул. Интернациональная, 5. • 8 (0232) 75-65-94; 8 (029) 192-37-18**

**3 января 2018 г. №1-С/2018 ИЗВЕЩЕНИЕ**

## о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ в г. Гомеле

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Наличие ограничений | Целевое назначение | Начальная стоимость, руб./коп. | Сумма задатка, руб./коп. | Затраты на подготовку документации, руб./коп. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | в районе улиц Гвоздичная и Аграрная (участок №8) | 340100000002005953 | 0,1500 | Органичений в использовании не имеет | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 25 557 руб. 60 коп. | 400 руб. 00 коп. | 2 528 руб. 34 коп. |
| 2 | ул. Полевая (район жилого дома №118а) | 340100000008005038 | 0,1500 | Водоохранная зона рек и водоемов | | 44 169 руб. 51 коп. | 400 руб. 00 коп. | 2 096 руб. 86 коп. |
| 3 | по ул. Старо-воловской, 13 | 340100000002005894 | 0,1400 | Водоохранная зона рек и водоемов, сетей и сооружений водоснабжения, электрических сетей. *Проведение комплекса противопаводковых мероприятий* | | 44 462 руб. 04 коп. | 400 руб. 00 коп. | 2 396 руб. 41 коп. |

1. Организатор аукционных торгов – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).
2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. №462. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданным эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3–6.
3. **Аукцион состоится 3 января 2018 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном кометете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115** при наличии не менее двух участников на каждый лот.
4. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, негосударственные юридические лица Республики Беларусь подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка, в размере, указанном в извещении, с отметкой банка, на **р/с 3012203080014 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, МФО 151501912. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того, **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указание транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» по адресу г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах).
4.1. гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;
4.2. представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;
4.3. представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.
4.4. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц – документ, удостоверяющий личность. Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.
5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору аукциона затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации, осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона. Если заявление на участие в аукционе подано только одним гражданином или юридическим лицом, земельный участок предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. №83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».
7. **Заявления с приложением необходимых документов для участия в аукционе принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 1 декабря по 29 декабря 2017 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6.**

Заключительная регистрация зарегистрированных участников аукциона с 14.40 в день проведения аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. №115

**Контактный телефон 41-97-86. Информация размещена на сайте: www.qomel.qov.by либо geodezcentr.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

| Дата, время, место проведения аукциона | **3 января 2018 года в 10.00** в здании Поставского районного исполнительного комитета (г. Поставы, пл. Ленина, 25, 4-й этаж, малый зал) |
|---|---|

| № лота | Адрес участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Наличие ограничений в использовании | Начальная цена, руб. | Сумма, подлежащая возмещению организатору аукциона на его проведение, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Юньковский сельисполком Витебская обл. Поставский район. д. Должа, ул. Центральная, 28 | 0,1661 | 224084907801000064 | Расположение на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема) – оз. Должа) | 4 000,00 | 1835,88 |

| | |
|---|---|
| Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона | – в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с их изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формирования земельного участка, в т. ч. государственной регистрации;<br>– в течение двух месяцев со дня утверждения протокола аукциона в установленном порядке обратиться за государственной регистрацией прав, ограничений прав на земельный участок;<br>– получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома;<br>– приступить к занятию земельного участка в течение года со дня государственной регистрации земельного участка, возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство) |
| Порядок осмотра на местности земельного участка | В рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по мере обращений лиц, заинтересованных в участии в аукционе. Обращаться в землеустроительную службу Поставского райисполкома г. Поставы, пл. Ленина, 25, 1-й этаж, каб. 11 |
| Перечень необходимых документов, представляемых участниками аукциона до его начала | – заявление на участие в аукционе (бланк можно получить и заполнить непосредственно в землеустроительной службе);<br>– квитанцию об уплате задатка;<br>– ксерокопии стр. 25, 31, 32, 33 общегражданского паспорта без нотариального засвидетельствования;<br>– представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность. |
| Место, дата и время начала и окончания приема заявлений | г. Поставы, пл. Ленина, 25, 1-й этаж, каб. 11<br>в рабочие дни с 8.00 до 17.00 со дня публикации извещения по **27 декабря 2017 года** включительно |
| Размер задатка, срок и порядок его внесения | 10% от начальной цены соответствующего участка до подачи заявления на счет сельисполкома.<br>Реквизиты платежа указаны в бланке заявления на участие в аукционе |
| Адрес и номер контактного телефона комиссии | г. Поставы, пл. Ленина, 25, 1-й этаж, каб. 11, в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00<br>телефоны: 8 (02155) 43180, 41132 |

# Каляндар стрыжак на снежань

**

**1 снежня, пятніца.** Стрыжка пагражае душэўнай раўнавазе. Афарбоўку валасоў варта адкласці.

**2 снежня, субота.** Няўдалы дзень для стрыжкі: рызыкуеце ўгнявіць Фартуну. Для нармалізацыі ўзаемаадносін варта выкарыстоўваць натуральныя фарбавальнікі светлых або рудых тонаў.

**3 снежня, нядзеля.** Сёння лепш не стрыгчыся і не рабіць ніякіх працэдур для валасоў, нават калі гэта звычайная маска, якую вы робіце заўсёды. Валасы могуць пашкодзіцца.

**4 снежня, панядзелак.** Не стрыжыцеся: здароўе даражэйшае. Непажаданая і любая афарбоўка валасоў — могуць узнікнуць фінансавыя і камунікатыўныя праблемы.

**5 снежня, аўторак.** Стрыжка, зробленая сёння, абавязкова павысіць ваш настрой і баявы дух. Для афарбоўкі валасоў не рэкамендуецца выкарыстоўваць сінтэтычныя фарбавальнікі, а вось натуральныя будуць прыцягваць грошы.

**6 снежня, серада.** Варта падстрыгчыся сёння, каб прыцягнуць на свой бок поспех у справах, вучобе і бізнесе. Дазваляецца афарбоўваць валасы толькі ў колер, які ўплывае на вас пазітыўна.

**7 снежня, чацвер.** Падстрыгаць валасы сёння — да праблем з грашыма і людзьмі, цяжкасцяў у працы і вучобе. Для афарбоўкі валасоў карыстайцеся толькі праверанымі колерамі.

**8 снежня, пятніца.** Вынік стрыжкі вас расчаруе. Не варта ў гэты дзень фарбаваць валасы.

**9 снежня, субота.** Змена прычоскі хоць і не паўплывае на стан валасоў, але не самым спрыяльным чынам адаб'ецца на агульным самаадчуванні. Ад афарбоўкі таксама ўстрымайцеся.

**10 снежня, нядзеля.** Адмоўцеся сёння ад стрыжкі. Афарбоўка таксама можа прайсці не вельмі ўдала.

**11 снежня, панядзелак.** Падстрыжыцеся сёння і афарбуйце валасы, калі хочаце пазбавіцца ад дэпрэсіі і дрэннага настрою. Праўда, валасы пачнуць больш секчыся — вось такая цана пазбаўлення ад меланхоліі і суму.

**12 снежня, аўторак.** Калі хочаце прыцягнуць у сваё жыццё новых людзей, разнастаіць будні захапляльнымі падзеямі, сустрэць сваё каханне, то падстрыгайцеся сёння. Добры дзень для афарбоўкі валасоў, будзеце задаволены.

**13 снежня, серада.** Тыя, хто выбера сённяшні дзень для стрыжкі, можа ў хуткім часе набыць уласнасць, а таксама адчуе спрыяльныя змены ў кар'еры. Афарбоўка валасоў сёння паспрые нармалізацыі адносін у калектыве.

**14 снежня, чацвер.** Стрыжка катэгарычна забароненая, бо яна можа паўплываць на ваш лёс неспрыяльным чынам. Афарбоўку таксама перанясіце на іншы дзень.

**15 снежня, пятніца.** Зрабіце стрыжку сёння, калі хочаце ў хуткім часе пазнаёміцца з цікавым чалавекам процілеглага полу. Добры дзень для афарбоўкі, колер валасоў атрымаецца яркі і ўстойлівы.

**16 снежня, субота.** Падстрыжыце валасы сёння, каб прыцягнуць у сваё жыццё грошы, поспех у бізнесе, гандлі. Можна эксперыментаваць з колерам валасоў.

**17 снежня, нядзеля.** Стрыгчы валасы не рэкамендуецца. Аддайце перавагу аб'ёмным укладкам. Афарбоўваць валасы сёння можна толькі ашчаднымі фарбавальнікамі.

**18 снежня, панядзелак.** Не стрыжыце валасы сёння, калі не хочаце згубіць сваё каханне. Неспрыяльны дзень і для афарбоўкі валасоў.

**19 снежня, аўторак.** Неспрыяльны дзень. Стрыжка можа прыцягнуць праблемы са здароўем. Адмоўцеся ад афарбоўкі таксама.

**20 снежня, серада.** Вынік стрыжкі вас расчаруе. Сёння наогул лепш адмовіцца ад любых працэдур з валасамі.

**21 снежня, чацвер.** Вынік стрыжкі перасягне вашы чаканні. Фарбавацца варта толькі ў светлыя колеры.

**22 снежня, пятніца.** Стрыжка валасоў сёння зробіць вас удачлівымі, палепшыцца здароўе. Добра фарбаваць валасы ў цёмныя адценні.

**23 снежня, субота.** Каб павысіць імунітэт, зрабіце незвычайную стрыжку, паэксперыментуйце з іміджам. Калі хочаце радыкальна змяніць колер валасоў, то сёння самы прыдатны час.

**24 снежня, нядзеля.** Стрыжка сёння хоць і паскорыць рост валасоў, але зробіць іх непаслухмянымі. Лепш за ўсё пафарбаваць валасы ў светлыя адценні, гэта дапаможа пазбегнуць большасці няўдач.

**25 снежня, панядзелак.** Стрыжка можа прывесці не толькі да матэрыяльных растрат, але і да пагаршэння здароўя. Лепш не фарбавацца.

**26 снежня, аўторак.** Лепш не эксперыментаваць, а зрабіце тую стрыжку, якую ўжо рабілі неаднаразова. Можна асвятляць і таніраваць валасы.

**27 снежня, серада.** Стрыжка валасоў ніяк не паўплывае на ваш лёс. Для афарбоўкі аддайце перавагу цёмным адценням.

**28 снежня, чацвер.** Сёння валасы, як і ўвесь астатні арганізм, аслабленыя, таму паспрабуйце ўстрымацца ад стрыжкі. Афарбоўку лепш адкласці.

**29 снежня, пятніца.** Нейтральны дзень для стрыжкі і афарбоўкі.

**30 снежня, субота.** Наведванне цырульніка ў гэты дзень дазволіць вам чароўна выглядаць на навагоднія святы.

**31 снежня, нядзеля.** Добры перыяд для стрыжкі і афарбоўкі валасоў. Не ўпусціце час.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.05 | 16.52 | 7.47 |
| Віцебск — | 9.01 | 16.35 | 7.34 |
| Магілёў — | 8.55 | 16.42 | 7.47 |
| Гомель — | 8.44 | 16.46 | 8.02 |
| Гродна — | 9.19 | 17.09 | 7.50 |
| Брэст — | 9.12 | 17.17 | 8.05 |

### Месяц

*Поўня 3 снежня.*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

### Імяніны

***Пр.*** *Мікалая, Платона, Рамана.*
***К.*** *Наталлі, Эдмунда, Элігіума.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 1 СНЕЖНЯ

**1792** год — нарадзіўся Мікалай Іванавіч Лабачэўскі, рускі матэматык, стваральнік неэўклідавай геаметрыі, мысліцель-матэрыяліст, дзеяч народнай асветы. З 1811 года працаваў у Казанскім універсітэце (з 1827-га — рэктар), з 1846-га — памочнік папячыцеля Казанскай навуковай акругі. Аўтар навуковых прац па алгебры, геаметрыі, матэматычным аналізе, механіцы, фізіцы і астраноміі.

**1800** год — Вашынгтон стаў сталіцай Злучаных Штатаў Амерыкі. Яшчэ 6 ліпеня 1790 года Кангрэс ЗША пастанавіў закласці горад плошчай 26 квадратных кіламетраў на рацэ Патамак. Месца для будаўніцтва выбраў першы прэзідэнт Джордж Вашынгтон. Тэрыторыю новай сталіцы назвалі акругай Калумбія ў гонар Хрыстафора Калумба, а сам горад — Вашынгтонам у гонар першага прэзідэнта ЗША.



**1890** год — нарадзіўся Васіль Канстанцінавіч Блюхер, савецкі ваенны дзеяч. У пачатку Першай сусветнай вайны пайшоў на фронт радавым, за баявыя заслугі ўзнагароджаны двума Георгіеўскімі крыжамі. Да пачатку Кастрычніцкай рэвалюцыі — член Самарскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, удзельнічаў ва ўсталяванні Савецкай улады. У 1921—1922 гадах — ваенны міністр, галоўнакамандуючы і член Ваеннага савета Народна-рэвалюцыйнай арміі Далёкаўсходняй Рэспублікі, кіраваў рэарганізацыяй арміі, разгромам белагвардзейцаў пад Валачаеўкай, узяццем Спасска ў 1922 годзе. У 1924—1927 гадах — галоўны ваенны саветнік пры кітайскім рэвалюцыйным урадзе, удзельнічаў у правядзенні вялікага Паўночнага паходу. У 1929—1938 гадах камандаваў войскамі асобай Чырванасцяжнай Далёкаўсходняй арміі, кіраваў разгромам кітайскіх мілітарыстаў падчас савецка-кітайскага канфлікту на Кітайска-Усходняй чыгунцы ў 1929 годзе і стварэннем абароны на Далёкім Усходзе. Улетку 1938-га, у перыяд разгрому японскіх мілітарыстаў на возеры Хасан, камандаваў Далёкаўсходнім фронтам. Адзін з першых маршалаў Савецкага Саюза. Рэпрэсіраваны ў 1938 годзе.

**1913** год — на заводзе амерыканскай кампаніі «Форд» быў запушчаны першы ў свеце канвеер па зборцы аўтамабіляў.

**1917** год — у Мінску адбыўся 3-і з'езд Саветаў сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў, які адобрыў дэкрэты савецкай улады аб міры і аб зямлі.

### Было сказана

**Мілáрад ПАВІЧ, сербскі паэт, празаік, перакладчык:**
*«Тваё мінулае хаваецца ў тваім маўчанні, сённяшняе — у тваіх словах, а будучыня — у тваіх памылковых кроках».*

## УСМІХНЕМСЯ

— Вова, ідзі абіраць бульбу.
— Ну, мама!
— Што «мама», як мандарыны — дык ты першы!

**У гараскопе напісана, што ў сярэдзіне дня мяне чакае нейкі спрыяльны перыяд, думаю, гэта абед.**

Жонка — мужу:
— Ты мне здраджваеш!
— Не выдумляй.
— А дзе ты быў усю ноч?
— На лаўцы спаў.
— Адзін?

**Упершыню ўбачыўшы джакузі, я падумаў, што пельмені ўжо можна засыпаць.**

40% жанчын зіма падабаецца, а 60% — не вельмі.
Тое ж апытанне паказала, што ў 40% жанчын ёсць футра, а ў 60% няма.

**— Вы часта сварыцеся з жонкай?**
**— Мы наогул не сварымся!**
**— Як гэта?!**
**— Адразу пераходзім да бойкі!**




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4426.
Нумар падпісаны ў 19.30 30 лістапада 2017 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12